СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 4.38, 21.40, 17.02.
Віцебск — 4.19, 21.38, 17.19.
Магілёў — 4.27, 21.29, 17.02.
Гомель — 4.33, 21.18, 16.45.
Гродна — 4.54, 21.54, 17.00.
Брэст — 5.04, 21.45, 16.41.
МЕСЯЦ:
Першая квадра 5 чэрвеня.
ІМЯНІНЫ:
Івана, Фядоссі;
Фелікса, Радаміра.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

11 ЧЭРВЕНЯ 1992 г.
чацвер, № 116 (21894)

ВОЗГАЛАС

БЕЗ ЛЕНІНА, АЛЕ З ЗЯМЛЁЙ

ІУЕУСКІ РАЕН (А. Дук). Адной з лепшых гаспадарак — калгаса імя Леніна — у раёне ўжо не будзе. Чаму? Ды таму, што калгаснікі, працуючы на палетках і фермах, не былі ўласнікамі зямлі. Вырашылі яны выправіць становішча і выйсці з гаспадаркі. Геранёнскі сельсавет, куды звярнуліся калгаснікі з просьбай аб выдзяленні зямлі, задаволіў жаданне людзей і адвёў ім па 2,8 гектара. Былыя калгаснікі ўтварылі аб'яднанне сялянскіх гаспадарак «Ніва».

ЗА МЯЖУ — З ШЫКАМ!

ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ (А. Дук). Кантрольна-прапускны пункт у Брузгах даўно ўжо не можа задаволіць імкненне жадаючых як найхутчэй выехаць за мяжу. Тут бясконцыя аўтамабільныя чэргі, антысанітарыя... Таму прынята рашэнне аб будаўніцтве новага прапускнога пункта. Работы ўжо вядуцца ў Бераставіцкім раёне. Па ўсім відаць, новы КПП будзе адпавядаць прынятым стандартам, у строй уступяць адразу чатыры прапускныя лініі.

МІНУЎШЧЫНЕ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

ПОЛАЦК (В. Пілік). Паўзабыты жанр дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва пачаў сваё адраджэнне на старажытнай полацкай зямлі. У залах мясцовага краязнаўчага музея адкрылася выстава ваенна-гістарычнай мініяцюры, традыцыі якой хаваюцца ў глыбіні стагоддзяў. Полацкі гісторыка-культурны запаведнік і творчае аб'яднанне «ПІКО» прысвяцілі яе 180-гадоваму юбілею вызвалення Полаччыны ад напалеонаўскага нашэсця.

Усяго ў залах музея дэманструецца 230 работ аўтараў з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Полацка, якія прадстаўляюць асноўныя напрамкі развіцця сучаснай ваенна-гістарычнай мініяцюры.

Зазірнём у 1993-ці...

РЭДАКЦЫЯЙ НАШАЙ ГАЗЕТЫ НАДРУКАВАНЫ І ВЫПУШЧАНЫ Ў СВЕТ ЛІСТАВЫ НАСЦЕННЫ КАЛЯНДАР НА НАСТУПНЫ ГОД.

У календары змешчаны дні беларускіх нацыянальных святаў і рэлігійныя святы на наступны год.

НАБЫВАЙЦЕ КАЛЯНДАР «ЗВЯЗДЫ» Ў КІЁСКАХ «САЮЗДРУКУ».

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

ДЗЕ АДПАЧЫВАЦЬ ПАКУТНІКАМ ЧАРНОБЫЛЯ?

«Звязда» ўжо неаднойчы пісала пра тую выключна напружаную экалагічную сітуацыю, што склалася ў басейне Лукомскага возера: «Храм ці публічны дом?» (5 сакавіка), «Ад каго чакаць міластыні?» (1 красавіка), «Возеру — ахоўную грамату» (29 красавіка). Гэта праблема стала падставай для дэталёвага абмеркавання яе на пасяджэнні калегіі Дзяржаўнага камітэта па экалогіі Рэспублікі Беларусь, дзе вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы. Здавалася б, усе пытанні вырашаны ці ў стане вырашэння. Але днямі ў рукі трапіў адзін дакумент, а менавіта здымак, на якім адлюстраваны вынікі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС па стану на 29 красавіка 1986 года (праз чатыры дні пасля трагедыі). Здымак гэты тады так і не з'явіўся ў нашым друку, прынамсі, я яго нідзе не бачыў, нават не ўяўляў пра яго існаванне. «Прарабам перабудовы» было, як кажуць, «не да таго». Ці не таму яны ўсімі сіламі спрабавалі схаваць праўду ад народа? Асабіста «маскоўскіх правадыроў» гэты злавесны язык не дапяў, — вецер пагнаў смяротную хмару на паўночны захад. Да таго ж у іх была цэлая сетка аздараўленчых устаноў у экалагічна чыстых мясцінах, задумвалася будаўніцтва цуда-жамчужыны ў Фаросе... А людзі па сутнасці былі пакінуты на волю лёсу, у поўным няведанні сапраўднага памеру трагедыі. За якія грахі іх пакінулі сам-насам з бядой?

Гэтыя і безліч іншых пытанняў узніклі самі па сабе, калі дырэктар выдавецтва «Дзеці Чарнобыля» Ліля Варэца пазнаёміла мяне з фотаздымкам. Сапраўды, чыстых тэрыторый вельмі мала. І сярод іх — Лукомль...

Расступіліся стромкія сосны — і вачам у які раз адкрылася дзівосная панарама: ледзь ці не да самага гарызонта разлілося, распласталася дзівадзіўнае — возера. Блакіт майскага неба, здавалася, саперничаў са сваім адбіткам у люстраной роўнядзі вады. Мне што: падобныя моманты мроіліся з ранняга дзяцінства, з таго самага дня, калі дзед упершыню прывёў на бераг, а босыя ногі адчулі ласкавы дотык яго хваляў. А вось на спадарожніцу маю варта было паглядзець — на твары ў Лілі Арцёмаўны адбілася цэлая гама пачуццяў: і здзіўленне, і захапленне, і радасць ад сустрэчы з цудоўным кутком прыроды. Яе, мастачку, няцяжка зразумець — прыгажосць нікога не пакідае раўнадушным.

— А я лічыла, што такое можа быць толькі ў казцы,— усміхнулася яна. — Гэта ж трэба, нервуемся, перажываем, мітусімся: куды везці дзяцей на адпачынак? А тут такое, здаецца, самім Богам дадзенае месцейка.

Яе голас вывеў з асалоды асляплення ад сустрэчы з харастаом і вярнуў у далёка не казачную рэчаіснасць. Такіх чыстых куточкаў на нашай зямлі не так ужо і многа, дакладней, амаль што не засталося. Быццам шчыгрынавая скура, скарачаюцца яны пад уздзеяннем жудаснай правы — радыяцыі. Здаецца, не так даўно суседні Крупскі раён лічыўся чыстым ад радыяцыі. І вось літаральна некалькі гадзін назад старшыня яго райсавета Уладзімір Хадасевіч паказаў на карце раёна «брудныя» плямы, праўда, адносна невялікія. Цяпер ужо цяжка дакладна сказаць, ці гэта «падарунак» таго красавіцкага дня, ці яны з'явіліся значна пазней? У зоне жорсткага радыяцыйнага кантролю людзі пражывалі гадамі, аралі зямлю, палілі ў печах, радыеактыўныя пыл і попел разносіліся па зямлі. Зноў жа лясныя пажары. А колькі шкоды прыродзе, і перш за ўсё жывым істотам, наносіць чалавек... А таму ў адказ на захапляльныя воклічы спадарожніцы мусіў скептычна зазначыць:

— А вы паглядзіце вунь туды,— кіўнуў я ў бок Лукомскай ДРЭС.— Бачыце тыя дымкі над трубамі?

— Ну і што,— паціснула яна плячамі.— Якое дачыненне мае да гэтага ДРЭС?

— Самае непасрэднае, — паспрабаваў запярэчыць ёй.— Цяпер, пасля пераводу чатырох блокаў з мазуту на газ, дымавыя шлейфы зменшыліся ў некалькі разоў. Раней жа яны цягнуліся на многія кіламетры, прыпраўляючы зямлю попелам, а паветра — вокісамі серы і іншымі небяспечнымі выкідамі. Возера ледзь спраўляецца з тымі нагрузкамі, якія аказваюць на яго восем блокаў электрастанцыі. А на чарзе будаўніцтва трэцяй чаргі.

На калегіі Дзяржкамітэта па экалогіі запэўнілі ў тым, што без належнай эканамічнай экспертызы не можа быць і размовы пра разгортванне трэцяй чаргі электрастанцыі. Есць рэзалюцыя намесніка Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь І. Кеніка, адрасаваная старшыням Віцебскага і Мінскага аблвыканкомаў В. Кулакову і А. Цішкевічу, старшыні Дзяржкамітэта па экалогіі А. Дарафееву, экалагічнаму пракурору В. Дземідовічу і міністру сельскай гаспадаркі Ф. Мірачыцкаму: «Прашу разгледзець факты, выкладзеныя ў карэспандэнцыі газеты «Звязда», і... прыняць меры да спынення парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства, прадухілення забруджвання возера Лукомскага».

На пасяджэнні калегіі мяне, праўда, некалькі насцярожыла адсутнасць там вышэйпамянёных кіраўнікоў (за выключэннем старшыні Дзяржкамітэта па экалогіі і прадстаўніка экалагічнай пракуратуры). Але ж, думалася, дасягнута галоўнае — створаны надзейныя заслоны на шляху будаўніцтва трэцяй чаргі ДРЭС, прыкрыты найбольш істотныя крыніцы забруджвання яго экваторы. Наіўны чалавек! Як лёгка падмануцца. Падманам аказалася і сцвярджэнне адказных работнікаў Дзяржкамітэта па экалогіі адносна жорсткай экалагічнай экспертызы праекта трэцяй чаргі Лукомскай ДРЭС. Як стала вядома з размовы з дырэктарам станцыі Львом Жураўлёвым, на праектна-пошукавыя работы сёлета выдаткавана ўжо 12 мільёнаў рублёў і яшчэ 7 мільёнаў неабходна асвоіць непасрэдна на само будаўніцтва. Словам, не трэба пускаць пыл у вочы: будаўніцтва трэцяй чаргі ДРЭС ужо распачалося. Праўда кіраўнік станцыі спаслаўся на тое, што ў рэспубліцы вялікі дэфіцыт энергіі і рэальна

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Пастанова

Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

АБ НАМЕСНІКАХ СТАРШЫНІ КАНТРОЛЬНАЙ ПАЛАТЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Зацвердзіць намеснікамі Старшыні Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь:

Корбута Мікалая Пятровіча,
Даўгалёва Васіля Барысавіча,
Радомскага Вячаслава Іванавіча.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

3 чэрвеня 1992 г.
г. Мінск.

Расія — сябар і надзейны партнёр

12 чэрвеня народы Расіі ўпершыню адзначаць Дзень незалежнасці. Спаўняецца год з дня ўтварэння новай дэмакратычнай расійскай дзяржавы. На тэрыторыі РФ гэты дзень аб'яўлены нерабочым. Напярэдадні свята карэспандэнт БЕЛТА сустрэлася са Старшынёй Савета Міністраў Беларусі Вячаславам Кебічам і папрасіла яго коратка прааналізаваць стан двухбаковых адносін з Расіяй, перспектывы іх развіцця. Кіраўнік беларускага ўрада сказаў:

— У нас, у Беларусі, цяпер стала модным крытыкаваць урад за тое, што ён, нібыта, ідзе ў фарватэры расійскай палітыкі. Робяць гэта і левыя сілы, і правыя. Я такой крытыкі рашуча не прымаю. Заяўляю з усёй адказнасцю: мы вядзём паўнакроўную самастойную палітычную лінію. Але грэбаваць існуючымі добрымі адносінамі з Расіяй было б проста неразумна. Наадварот, у дзелавых і ўзаемавыгадных адносінах з велізарнай краінай мы бачым вялікія магчымасці для дынамічнага развіцця Беларусі.

Хачу вярнуцца крыху назад, да пачатку 1992 года. Кіраўніцтва рэспублікі з пэўнай трывогай уступала ў паласу пераходу да рынкавых адносін. Мы не кінуліся, па прыкладу іншых, у рынак, як у вір галавой, і не пабаяліся пакінуць у прамысловасці дзяржаўны заказ. Гэта дало магчымасць пазбегнуць анархіі, захаваць эканамічную раўнавагу і кантраляваць сітуацыю.

Але распад Саюза ССР паставіў яшчэ адну вельмі складаную задачу — тэрмінова наладжваць новыя эканамічныя сувязі паміж краінамі СНД. Вядома, у першую чаргу мы звярнуліся да вялікай Расіі. Гэта і зразумела, таму што ў нашым агульным валавым нацыянальным прадукце яна займае самае вялікае месца. У многіх беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў склаліся добрыя, набудаваныя на ўзаемных інтарэсах і павазе адносіны. Адмовіцца ад усяго гэтага на карысць некаторым палітыкам? Такі крок, акрамя шкоды абодвум бакам, нічога б не прынёс.

Не буду скрываць, спачатку нам цяжка ішлі насустрач. Не выключаю, што камусьці было выгадна прадставіць справу так, быццам ёсць супярэчнасці паміж «беларускімі кансерватарамі» і «расійскімі рэфарматарамі». І на сёння ўсе праблемы паміж нашымі краінамі не вырашаны да канца. Але ўжо смела можна гаварыць аб галоўным—узаемнае прыцяжэнне бясспрэчнае. Як саміх славянскіх дзяржаў, так і іх кіраўнікоў. У нас няма ніякай неабходнасці рабіць падножкі адзін аднаму. Я ад душы жадаю расіянам справіцца з цяжкасцямі. Расія павінна выстаяць і, як фенікс, адрадзіцца з попелу яшчэ больш магутнай і цудоўнай.

26 чэрвеня ў нас, у Мінску, намечана правесці чарговую сустрэчу кіраўнікоў урадаў СНД. Я як прэм'ер-міністр рэспублікі, у якой знаходзіцца штаб-кватэра Садружнасці, зраблю ўсё, каб яна існавала, а не распалася.

На жаль, мы не бяром прыклад з еўрапейскіх дзяржаў, якія імкнуцца да інтэграцыі ў рамках адзінай Еўропы. Бо ніхто ў свеце не сумняваецца ў суверэннасці і незалежнасці нават самых маленькіх з іх. І краінам СНД ніхто не перашкаджае, застаючыся незалежнымі, мець добрыя адносіны адна з адной і дапамагаць у меру сіл зноў-такі адна адной эканамічна, застаючыся ў Садружнасці. Тым больш, што мы пакуль што з'яўляемся «сіямскімі блізнятамі», не гатовымі да раз'яднання. Зыходзячы з гэтага, заклікаю захаваць Садружнасць. Я разумею, што ў гісторыі можа здарыцца ўсякае. Дапускаю нават, што хтосьці з цяперашніх членаў Садружнасці можа яе пакінуць. Але рабіць з гэтага трагедыю, панікаваць прычын няма.

Цяпер мы з уласцівым беларускаму народу спакоем распрацоўваем канцэпцыю двухбаковых узаемаадносін з усімі рэспублікамі СНД. Вось гэтаму прыклад. 26 чэрвеня мы маем намер заключыць шматпланавы, усеабдымны дагавор з Расіяй. Яго падпішуць міністры замежных спраў. Так што ў будучыню беларуска-расійскіх адносін я гляджу з аптымізмам.

Валянціна МЕНШЫКАВА, кар. БЕЛТА.

У Прэзідыуме Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

У Доме ўрада пад старшынствам В. Кебіча адбылося чарговае пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Па двух першых пытаннях парадку дня — «Аб канцэпцыі дарожнага будаўніцтва і генеральнай схеме развіцця сеткі аўтамабільных дарог Рэспублікі Беларусь» і «Аб праекце закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўтамабільных дарогах» — з дакладам выступіў міністр будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог С. Яцута. Адзначана, што ў рэспубліцы на долю аўтамабільнага транспарту прыпадае 70 працэнтаў аб'ёму грузавых і 65 працэнтаў аб'ёму пасажырскіх перавозак. За апошнія гады з прычыны інтэнсіўнага развіцця гэтага віду транспарту шчыльнасць яго руху па дарогах павялічылася ў 3—5 разоў, а сярэдняя грузападымальнасць аўтамабіляў узрасла ў 2—2,5 раза. На гэтым фоне кантрастна праявіліся недахопы ў развіцці сеткі аўтадарог. Сёння многія з іх з цяжкасцю адпавядаюць мінімальным сучасным патрабаванням. У рэспубліцы мала дарог з цвёрдым пакрыццём — усяго толькі 337 кіламетраў на 1.000 кв. км тэрыторыі (у развітых еўрапейскіх краінах гэты паказчык роўны ў сярэднім 906 кіламетрам). Многія дарогі патрабуюць рамонту.

Канцэпцыя праграмы Міндарбуду, прадстаўленая Прэзідыуму, прадугледжвае да 2005 года ўвесці ў дзеянне толькі ў сельскай мясцовасці 75—80 тысяч кіламетраў дарог з цвёрдым пакрыццём, а таксама рэканструяваць каля 18 тысяч кіламетраў важнейшых грузанапружаных аўтамагістраляў. У выніку будзе ліквідавана бездарожжа ў сельскай мясцовасці, усе населеныя пункты звяжуцца сеткай добраўпарадкаваных дарог, шчыльнасць пазагарадскіх дарог з цвёрдым пакрыццём будзе даведзена да 626 кіламетраў на 1.000 кв. км тэрыторыі рэспублікі. Прадугледжваецца развіццё сервіснага абслугоўвання для транспарту, матэрыяльна-тэхнічнае і фінансавае забеспячэнне дарожнай гаспадаркі.

Іменна апошняе — фінансаванне дарожнага будаўніцтва ў рэспубліцы — выклікала больш за ўсё пытанняў да дакладчыка ва ўдзельнікаў пасяджэння. Старшыня Савета Міністраў В. Кебіч прама ўказаў на яўную недаацэнку гэтай праблемы складальнікамі дакумента. Даручана дапрацаваць яго ў адпаведнасці з выказанымі заўвагамі.

Рэзкай крытыцы на пасяджэнні быў падвергнуты даклад старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта рэспублікі Г. Шкурдзя «Аб дадатковых мерах па ўпарадкаванню абстаноўкі на пагранічных пераходах Брэсцкай і Гродзенскай абласцей». Паводле заўвагі старшынствуючага, прадстаўлены праект пастановы па гэтаму пытанню напісаны ў горшых традыцыях мінулага на ўзроўні вядомых шаблонаў: «узняць—павысіць», «шырэй—глыбей». Праект не зацверджаны. Г. Шкурдзю ўказана на асабістую адказнасць за навядзенне парадку ў мытнай службе рэспублікі.

Зусім іншую ацэнку атрымалі праекты дакументаў да наступнага пункта парадку дня —«Пытанні стварэння марскога гандлёвага флоту Рэспублікі Беларусь», з дакладам па якому выступіў першы намеснік міністра транспарту А. Гулецкі.

Стварэнне марскога гандлёвага флоту, як гэта ні здасца дзіўным, цяпер з'яўляецца жыццёва неабходным для нашай рэспублікі. Толькі на фрахтаванне замежных суднаў для перавозкі грузаў траціцца каля 30—40 працэнтаў кошту прададзеных-купленых тавараў, або больш як 100 млн. долараў штогод. Такім чынам, марскі гандлёвы флот можа стаць важнай крыніцай паступлення валютных сродкаў. Разлікі паказваюць, што толькі пры перавозцы калійных угнаенняў, адпраўляемых праз порт Вентспілс (1,25 млн. тон) уласнымі суднамі, Беларусь атрымала б дадатковы даход у суме 18,9 млн. долараў. Марскія судны могуць быць набыты шляхам атрымання адпаведнай долі з саставу былога саюзнага гандлёвага і ваеннага флатоў, а таксама за кошт стварэння сумесных прадпрыемстваў з замежнымі фірмамі, акцыянерных прадпрыемстваў, арэнды флоту ў іншых краін СНД і Прыбалтыкі.

На пасяджэнні Прэзідыума заслуханы таксама справаздача «Аб рабоце выканаўчых камітэтаў Мінскіх гарадскога і абласнога Саветаў народных дэпутатаў па рэалізацыі канцэпцыі жыллёвага будаўніцтва ў частцы выдзялення тэрыторый і зямельных участкаў для індывідуальнага будаўніцтва», даклад «Аб эфектыўнасці дзейнасці сумесных прадпрыемстваў, створаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», а таксама некаторыя іншыя пытанні сацыяльна-эканамічнага жыцця рэспублікі.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.
БЕЛТА.

СТРАДЫЁФАКТ

У Мар'інагорскім гарнізоне прайшлі ўрачыстасці з выпадку ўзвядзення пад дах аб'ектаў ваеннага гарадка, які будуецца для вайскоўцаў, што выводзяцца з тэрыторыі былой ГДР.

Падпісана шэсць кантрактаў на будаўніцтва такіх гарадкоў, у тым ліку ў Барысаве, Баранавічах, Слоніме, Лідзе, Бярозе. Адзін з жылых масіваў у Барысаве здадзены ў эксплуатацыю. Будаўніцтва астатніх завершыцца да канца гэтага года.

***

Суд Цэнтральнага раёна г. Мінска задаволіў іск начальніка ўпраўлення Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Генадзя Данілава. Нагадаем: ён падаў у суд на газету «Свабода» за тое, што яна апублікавала кампраметуючы яго матэрыял з фальшывымі данымі. «Народная газета» змясціла артыкул, які абараняў Данілава. У выніку суд вынес рашэнне, у адпаведнасці з якім газета «Свабода» атрымала 70 тысяч рублёў, а яе карэспандэнт — 30 тысяч рублёў штрафу.

***

З новым харчовым і лекавым сродкам пазнаёмяць жыхароў нашай рэспублікі ўдзельнікі міжнароднай канферэнцыі па выкарыстанню прэпарата «сел-гард». Ён эфектыўны для тых, хто пацярпеў ад чарнобыльскай катастрофы. Канферэнцыя пройдзе ў Мінску 15—16 чэрвеня.

***

Зацверджана рэспубліканская дэлегацыя для вядзення перагавораў з Расійскай Федэрацыяй па распрацоўцы праекта міжурадавага пагаднення аб урэгуляванні фінансава-эканамічных пытанняў, звязаных з уладкаваннем у Беларусі злучэнняў і часцей Заходняй групы войск, якія выводзяцца з Федэратыўнай Рэспублікі Германіі. Узначальвае дэлегацыю намеснік міністра замежных спраў Уладзімір Астапенка.

***

З мэтай расшырэння спецыялізацыі падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў для Узброеных Сіл рэспублікі, беларускі ўрад пастанавіў пераўтварыць Мінскае вышэйшае ваенна-педагагічнае агульнавайсковае вучылішча ў Мінскае вышэйшае ваенна-камандное вучылішча. Яно будзе спецыялізавацца на перападрыхтоўцы афіцэраў каманднага профілю. Да 1995 года плануецца перайсці на трохгадовае навучанне ў Мінскім суваровскім ваенным вучылішчы.

Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Аб зацвярджэнні Палажэнняў аб Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры, Камітэце па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры і яго складзе

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляюць:**

1. Зацвердзіць Палажэнне аб Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (прыкладаецца).
2. Зацвердзіць Палажэнне аб Камітэце па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (прыкладаецца).
3. Зацвердзіць склад Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (прыкладаецца).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.
Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. КЕБІЧ.

19 мая 1992 г.
г. Мінск.

(Тэксты пастаноў на 2-й стар.).

Зацверджана пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 мая 1992 г. № 1671-XII

ПАЛАЖЭННЕ

Аб Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры

1. Дзяржаўныя прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры прысуджаюцца за таленавітыя, глыбокія па эместу і адметныя па форме творы літаратуры, музыкі, выяўленчага мастацтва, тэатра, кіно, архітэктуры, за выдатныя дасягненні выканальніцкага майстэрства, якія маюць эстэтычную вартасць, уносяць значны ўклад у беларускую нацыянальную культуру, развіваюць мастацкія традыцыі, узбагачаюць духоўнае жыццё народа, садзейнічаюць усталяванню агульначалавечых каштоўнасцей і ідэй гуманізму, узвышаюць сусветны аўтарытэт нацыянальнай культуры Рэспублікі Беларусь, а таксама за маштабныя публікацыі ў галіне журналістыкі, за выдатныя даследчыя работы ў галіне літаратуразнаўства і мастацтвазнаўства, тэорыі і гісторыі мастацтва.

2. Дзяржаўныя прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры прысуджаюцца адзін раз у два гады (кожны цотны год) у наступнай колькасці:

за творы паэзіі і драматургіі — адна прэмія імя Янкі Купалы;

за творы прозы, работы ў галіне літаратуразнаўства і крытыкі — адна прэмія імя Якуба Коласа;

за творы літаратуры і мастацтва для дзяцей і юнацтва — адна прэмія;

за работы ў галіне мастацкай публіцыстыкі (літаратура, мастацтва)— адна прэмія імя Кастуся Каліноўскага;

за значныя работы ў галіне журналістыкі — адна прэмія;

за музычныя творы буйных і малых форм, а таксама за канцэртна-выканальніцкую дзейнасць — адна прэмія;

за шырока прызнаныя работы рэжысёраў, дырыжораў, балетмайстраў, хормайстраў, артыстаў, мастакоў, сцэнарыстаў, кампазітараў і драматургаў, аператараў у пастаноўках тэатраў, кінастудый, на тэлебачанні і радыёвяшчанні — дзве прэміі;

за творы жывапісу, скульптуры, графікі, манументальна-дэкаратыўнага і прыкладнога мастацтва — адна прэмія;

за арыгінальную архітэктуру грамадзянскіх, прамысловых і жылых збудаванняў у горадзе і на вёсцы — адна прэмія;

за даследаванні па тэорыі і гісторыі мастацтва і архітэктуры, а таксама падручнікі для спецыяльных навучальных устаноў па архітэктуры і мастацтвазнаўству — адна прэмія.

Памер прэміі ўстанаўліваецца пры прыняцці рашэння аб яе прысуджэнні Прэзідыумам Вярхоўнага Савета і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

3. Вылучэнне работ на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь праводзіцца міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі, ведамствамі, творчымі, грамадскімі аб'яднаннямі, установамі культуры, навуковымі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, працоўнымі калектывамі, рэдакцыямі газет і часопісаў, выдавецтвамі. Работы вылучаюцца на пасяджэннях калегій, прэзідыумаў, сакратарыятаў праўленняў, мастацкіх, рэдакцыйна-выдавецкіх і вучоных саветаў, на сходах працоўных калектываў у абстаноўцы высокай патрабавальнасці да ацэнкі кожнага твора, творчага ўкладу кожнага аўтара пры шырокім удзеле грамадскасці і забеспячэнні поўнай галоснасці.

4. На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь могуць вылучацца творы літаратуры і мастацтва, навуковыя працы і архітэктурныя збудаванні, апублікаваныя (публічна выкананыя, збудаваныя) не менш чым за год да заканчэння прыёму работ.

Творы літаратуры, журналістыкі, публіцыстыкі, выяўленчага мастацтва, архітэктуры, навуковыя працы павінны быць апублікаваны (выстаўлены для публічнага паказу, збудаваны) не больш чым за пяць гадоў, а кіна- і тэлефільмы, тэатральныя, радыё- і тэлеспектаклі, канцэртныя праграмы публічна выкананы (паступіўшыя ў пракат) не больш чым за тры гады да даты прысуджэння прэміі.

На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь не дапускаецца вылучэнне работ, якія вылучаны на атрыманне прэміі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, міжнародныя прэміі, прэміі іншай дзяржавы, або якія атрымалі такія прэміі.

5. Калектыў, які вылучаецца на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, павінен уключаць толькі асноўных аўтараў, чый творчы ўклад быў вызначальным. У склад калектыву не могуць быць вылучаны асобы толькі на прыкметах адміністрацыйнага, кансультацыйнага ці арганізацыйнага саўдзелу. Колькасць паборнікаў на атрыманне Дзяржаўнай прэміі ў калектыве не павінна перавышаць 8 чалавек, у склад аўтарскага калектыву могуць быць уключаны і асобы, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь.

6. Работы, якія вылучаюцца на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прымаюцца Камітэтам па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры* на працягу двух гадоў да 1 лютага года, у якім яна прысуджаецца.

Парадак вылучэння і афармлення дакументаў вызначаецца інструкцыяй, якая зацвярджаецца прэзідыумам Камітэта.

7. Работы, вылучаныя на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, Камітэт разглядае ў два этапы: на першым этапе ідзе адбор работ для ўдзелу ў конкурсе, на другім — прымаецца рашэнне аб прысуджэнні прэміі.

Спіс дапушчаных да ўдзелу ў конкурсе работ публікуецца ў «Народнай газеце», газетах «Звязда», «Советская Белоруссия», «Рэспубліка», «Літаратура і мастацтва», «Культура» не пазней 1 мая.

8. Для ўсебаковага і прынцыповага абмеркавання вылучаных на конкурс работ скарыстоўваюцца сродкі масавай інфармацыі — друк, радыё, тэлебачанне, а таксама сходы працоўных калектываў і нарады творчых саюзаў, культурных фондаў і таварыстваў. Матэрыялы ўсіх абмеркаванняў, уключаючы і сродкі масавай інфармацыі, не пазней 1 лістапада прадстаўляюцца ў Камітэт той арганізацыяй ці ўстановай, якая вылучала свае кандыдатуры на атрыманне прэміі. Тым самым забяспечваецца выкарыстанне гэтых матэрыялаў пры канчатковым вырашэнні пытання аб прысуджэнні прэмій.

Арганізацыя праглядаў і праслухоўвання спектакляў, канцэртных праграм, кіна- і тэлефільмаў, выставак твораў выяўленчага мастацтва ў час правядзення секцыйных і пленарных пасяджэнняў Камітэта, а таксама аглядаў архітэктурных твораў у натуры ўскладаецца на Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па архітэктуры і будаўніцтву разам з Камітэтам па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

9. Рашэнне Камітэта аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій прадстаўляецца ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета і Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 снежня і ўступае ў сілу пасля зацвярджэння яго Прэзідыумам Вярхоўнага Савета і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Пастанова аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій публікуецца ў друку да 1 студзеня.

10. Асобам, удастоеным Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь, прысвойваецца званне «Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь», ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаюцца Дыплом і Ганаровы знак лаўрэата. Пры прысуджэнні Дзяржаўнай прэміі калектыву аўтараў грашовая частка прэміі дзеліцца паміж імі пароўну.

11. Дыплом і Ганаровы знак памёршага лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і ўзнагароджанага пасмяротна ўручаюцца яго сям'і. Грашовая частка прэміі перадаецца па спадчыне ў парадку, прадугледжаным грамадзянскім заканадаўствам.

* У далейшым — Камітэт.

Зацверджана пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 мая 1992 г. № 1671-XII

ПАЛАЖЭННЕ

Аб Камітэце па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры

1. Камітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры* фарміруецца з ліку найбольш аўтарытэтных майстроў літаратуры, мастацтва і архітэктуры, вучоных-літаратуразнаўцаў і мастацтвазнаўцаў, крытыкаў з улікам прапаноў міністэрстваў і ведамстваў, творчых саюзаў і аб'яднанняў рэспублікі і зацвярджаецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь тэрмінам на 4 гады. Знаходжанне ў яго складзе дапускаецца не больш 8 гадоў.

Для кіраўніцтва работай Камітэта ствараецца прэзідыум у складзе старшыні Камітэта, яго намесніка, старшыні (кіраўнікоў) секцый і адказнага сакратара.

Спіс членаў Камітэта і інфармацыя аб змяненнях у ім публікуюцца ў друку.

2. На Камітэт ускладаецца прысуджэнне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

3. У адпаведнасці з мэтамі яго дзейнасці Камітэт:

прымае вылучаныя на атрыманне Дзяржаўных прэмій творы і работы, устанаўлівае на падставе дакументаў захаванне парадку іх вылучэння, публікуе спіс прынятых работ у «Народнай газеце», газетах «Звязда», «Советская Белоруссия», «Рэспубліка», «Літаратура і мастацтва», «Культура»;

адбірае найбольш вартыя работы для ўдзелу ў конкурсе;

наладжвае іх шырокае і актыўнае абмеркаванне, выяўляе ацэнкі шырокай грамадскасці;

разглядае дапушчаныя да конкурсу работы, аналізуе меркаванні чытачоў ці гледачоў, наладжвае работу творчых секцый Камітэта, забяспечвае актыўны ўдзел іх членаў у дыскусіях, дабіваецца грунтоўнасці ўсіх вываднаў;

прымае рашэнні аб прысуджэнні прэмій і прапануе іх на зацвярджэнне Прэзідыуму Вярхоўнага Савета і Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь;

афармляе Дыпломы і Ганаровыя знакі лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і наладжвае іх уручэнне;

арганізуе выплату лаўрэатам грашовай часткі прэміі;

садзейнічае распаўсюджванню сродкамі масавай інфармацыі творчага вопыту і дасягненняў лаўрэатаў.

4. Камітэту надаецца права:

утвараць секцыі і экспертныя камісіі па асобных галінах літаратуры, мастацтва і архітэктуры, журналістыкі, тэорыі і гісторыі мастацкай творчасці для разгляду вылучаных на прэмію работ і падрыхтоўкі абгрунтаваных заключэнняў аб узроўні гэтых работ, а таксама рэкамендацый па іх;

накіроўваць на экспертны разгляд навукова-даследчыя і вышэйшым навучальным установам, міністэрствам і ведамствам вылучаныя на атрыманне прэміі творы і работы;

накіроўваць членаў Камітэта або экспертаў знаёміцца на месцы з манументальнымі творамі і работамі;

запрашаць да рэцэнзавання вылучаных работ спецыялістаў у галіне літаратуры, мастацтва, архітэктуры з аплатай са сродкаў Міністэрства культуры рэспублікі;

кантраляваць захаванне ўстаноўленага парадку вылучэння і экспертнага разгляду работ, прадстаўленых на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

5. Пасяджэнні Камітэта лічацца правамоцнымі пры наяўнасці не менш 2/3 яго складу. Рашэнні Камітэта аб адборы работ для далейшага абмеркавання прымаюцца тайным галасаваннем. Для вылучэння работы на конкурс яна павінна набраць не менш 1/2 галасоў, а для прысуджэння прэміі — не менш 3/4 галасоў ад ліку прысутных.

Калі на Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь вылучана работа члена Камітэта, аўтар яе не прымае ўдзелу ў рабоце секцый і пленумаў Камітэта, якія разглядаюць творы, вылучаныя на атрыманне прэмій.

6. Рашэнні Камітэта аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь уступаюць у сілу пасля іх зацвярджэння Прэзідыумам Вярхоўнага Савета і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

7. Камітэт мае гербавую пячатку са сваёй назвай.

* У далейшым — «Камітэт».

Зацверджаны пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 мая 1992 г. № 1671-XII

СКЛАД

Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры

Гілевіч Н. С. — народны паэт Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, прафесар (старшыня Камітэта).

Шаранговіч В. П. — графік, рэктар Беларускай акадэміі мастацтваў, народны мастак Беларусі (намеснік старшыні Камітэта).

Юрэвіч У. М. — празаік, крытык, заслужаны работнік культуры Беларусі (адказны сакратар Камітэта).

Адамчык В. У. — празаік, галоўны рэдактар часопіса «Бярозка».

Барадулін Р. І. — паэт, загадчык рэдакцыі выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Брыль І. А. — народны пісьменнік Беларусі.

Буралкін Г. В. — старшыня праўлення Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь, скульптар.

Быкаў В. У. — народны пісьменнік Беларусі.

Бялянкін В. С. — архітэктар Белдзяржпраекта, заслужаны архітэктар Беларусі.

Вашчанка Г. Х. — прафесар Беларускай акадэміі мастацтваў, народны мастак Беларусі.

Вярцінскі А. І. — паэт, заслужаны работнік культуры Беларусі.

Гільдзюк Ю. М. — піяніст, мастацкі кіраўнік Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Градаў Ю. М. — галоўны архітэктар праектаў інстытута «Мінскпраект», заслужаны архітэктар Беларусі.

Далідовіч Г. В. — пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць».

Дашук В. Н. — кінарэжысёр, народны артыст Беларусі.

Дрынеўскі М. Н. — хормайстар, старшыня праўлення Саюза музычных дзеячаў Рэспублікі Беларусь, народны артыст Беларусі.

Дударэў А. А. — драматург, галоўны рэдактар часопіса «Мастацтва Беларусі», старшыня праўлення Саюза тэатральных дзеячаў Рэспублікі Беларусь.

Еўдакімаў У. М. — намеснік дырэктара інстытута «Гродназграмадзянпраект», заслужаны архітэктар Беларусі.

Жук А. А. — пісьменнік, член Рады Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь.

Заборскі Г. У. — галоўны архітэктар праектаў інстытута «Дзіпрасельбуд», народны архітэктар СССР.

Законнікаў С. І. — паэт, галоўны рэдактар часопіса «Полымя».

Захарэвіч М. Г. — артыстка Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, народная артыстка Беларусі.

Зуёнак В. В. — паэт, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь.

Кавалеўскі Я. М. — архітэктар, старшыня праўлення Саюза архітэктараў Рэспублікі Беларусь.

Казінец М. А. — рэктар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, народны артыст Беларусі.

Казько В. А.—пісьменнік, галоўны рэдактар сцэнарнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм».

Калеснік У. А. — літаратуразнавец, прафесар, прарэктар Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна, заслужаны дзеяч вышэйшай школы Беларусі.

Картэс С. А. — кампазітар, дырэктар Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

Карачун Ю. А. — мастацтвазнавец, дырэктар Дзяржаўнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Кашкурэвіч А. М. — мастак-графік, народны мастак Беларусі.

Класкоўскі А. У. — намеснік галоўнага рэдактара «Народнай газеты».

Клебановіч М. І. — празаік, галоўны рэдактар сцэнарнай калегіі і творчага аб'яднання «Тэлефільм».

Красінскі А. В. — сустаршыня праўлення Саюза кінематаграфістаў Рэспублікі Беларусь, доктар мастацтвазнаўства.

Крыжаноўскі М. А. — агляльнік абласной газеты «Віцебскі рабочы».

Кудравец А. Н. — пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Неман».

Куліцкі А. В. — рэдактар «Настаўніцкай газеты».

Куляшоў У. А. — артыст Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа, народны артыст Беларусі.

Куляшова Г. Р. — загадчык аддзела Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі, доктар мастацтвазнаўства.

Лукашук А. М. — галоўны рэдактар выдавецтва «Беларусь».

Лучанок І. М. — кампазітар, старшыня праўлення Саюза кампазітараў Рэспублікі Беларусь, народны артыст СССР і Беларусі.

Літвіна Ж. М.— галоўны рэдактар Галоўнай рэдакцыі вяшчання для моладзі Беларускага радыё.

Мяснікоў А. Ф. — палітычны аглядальнік газеты «Звязда».

Навуменка І. Я. —пісьменнік, доктар філалагічных навук.

Нікіфараў В. А. — кінарэжысёр, сустаршыня праўлення Саюза кінематаграфістаў Рэспублікі Беларусь.

Разанаў А. С. — паэт.

Рылатка У. П. —намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь.

Савіч У. П. — мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

Савіцкі М. А. — жывапісец, народны мастак СССР і Беларусі.

Сачанка Б. І. — пісьменнік, загадчык рэдакцыі выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Скарабагатаў В. І. — саліст Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, заслужаны артыст Беларусі.

Смольскі Д. Б. — кампазітар, народны артыст Беларусі.

Тураў В. Ч. — кінарэжысёр, народны артыст СССР.

Чыгрынаў І. Г. — пісьменнік, старшыня праўлення Беларускага фонду культуры, галоўны рэдактар часопіса «Спадчына».

Шамякін І. П. — галоўны рэдактар Галоўнай рэдакцыі Беларускай Савецкай Энцыклапедыі імя П. У. Броўкі, член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі, народны пісьменнік Беларусі.

Янкоўскі Р. І.—артыст Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага, народны артыст СССР.

Яроменка М. М. — прэзідэнт Канфедэрацыі творчых Саюзаў і культурных фондаў Рэспублікі Беларусь, народны артыст СССР.

Як зарабіць мільярды?

Сацыяльнае забеспячэнне ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў павінна быць гарантавана спецыяльнай дзяржаўнай праграмай. Гэта думка стала асноўнай тэмай гутаркі намесніка міністра абароны Віктара Ісайчанкава з прадстаўнікамі Узброеных Сіл рэспублікі, якая адбылася 9 чэрвеня. Ініцыятарам гэтай сустрэчы стаў Фонд Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай абароне ваеннаслужачых абавязковай службы і запасу. У ёй таксама прынялі ўдзел прадстаўнікі Савета ветэранаў, арганізацыі суваўцаў-нахімаўцаў.

У наш складаны час цяжка жывецца ўсім. Але, бадай, найбольшую няўпэўненасць у будучым цяпер адчуваюць ваеннаслужачыя, якія застаюцца без прывычнай прафесіі і работы. Якія перспектывы іх далейшага працаўладкавання? Ці змогуць іх сем'і абзавесціся жыллём? Што збіраецца зрабіць Міністэрства абароны і ўрад, каб дзесяткі тысяч афіцэраў не аказаліся выкінутымі за борт? Якім чынам неабходна праводзіць перараз мяркаванне матэрыяльных каштоўнасцей з Узброеных Сіл у народную гаспадарку? Гэта толькі невялікая частка пытанняў, якія прагучалі ў адрас намесніка міністра.

Падзяляючы трывогу сваіх калег, Віктар Ісайчанкаў паведаміў, што Саветам Міністраў распрацоўваецца дзяржаўная праграма сацыяльнай дапамогі ваеннаслужачым. Ён адзначыў, што яе мэта —аказанне ўсямернай падтрымкі не толькі тым, хто застаецца служыць ва Узброеных Сілах, але і збіраецца з імі расстацца. Міністэрства абароны ўжо цяпер сур'ёзна заклапочана пытаннямі перападрыхтоўкі. Ён паведаміў, што ў Калодзішчах з дапамогай Германіі ствараецца Цэнтр для навучання звольненых у запас з Заходняй групы войск. На гэтыя мэты германскім бокам ужо выдзелена 8,2 мільёна марак. Гаворачы аб узнікшых пры ваенкаматах чэргах на жыллё, намеснік міністра растлумачыў, што выкліканы яны тым, што ў рэспубліку прыбывае велізарная колькасць звольненых у запас з іншых краін Садружнасці. Ваеннае ведамства пакуль што не ў стане забяспечыць жыллём прыбываючых, і гэта праблема павінна вырашацца на дзяржаўным узроўні.

Зразумела, што любая праграма патрабуе ўкладання грашовых сродкаў. Дзе іх узяць? Адзін з выхадаў прапанавалі ўдзельнікі праведзенай гутаркі. Фондам сацыяльнай дапамогі ваеннаслужачых распрацавана канцэпцыя перапрацоўкі ў адпаведнасці з грамадзянскімі патрэбамі ваеннай тэхнікі, надання ёй добрага таварнага выгляду. Бо не сакрэт, што ўтылізацыя тэхнікі да гэтага часу ажыццяўляецца варварскім спосабам, ператвараючы ўкладзеныя ў яе мільярды ў дым. Дастаткова ўспомніць, як праходзіла знішчэнне лепшага ў свеце ракетнага комплексу «Ака». Між тым амерыканцы, напрыклад, ужо цяпер гатовы выплаціць Беларусі палавіну сваіх прыбыткаў, калі рэспубліка прадаставіць ім для перапрацоўкі боепрыпасы, у якіх скончыўся тэрмін захоўвання. Размова ідзе аб сотнях мільёнаў долараў, якія рэспубліка, маючы высокі навуковы патэнцыял і развітую прамысловую базу, змагла б зарабляць самастойна. Удзельнікі сустрэчы адзначылі, што для гэтага ёсць усе неабходныя прадпасылкі. У выніку ў выйгрышы могуць аказацца і дзяржава, і ваеннаслужачыя.

Ларыса ЛАЗАР,
кар. БЕЛТА.

Той, хто думае, што работнікі пажарнай службы спяць у час дзяжурства, глыбока памыляецца. Невыпадкова на тэрыторыі калгаса «Барацьба» Пухавіцкага раёна стварылі міжгаспадарчы апорны пункт пажарнай аховы. Начальнік варты Аляксандр МАЛАШ і вадзіцель Анатоль ЧАХОЎСКІ сцяжарджаюць: летам у цёплае надвор'е штодзённа ім даводзіцца тушыць пажары — іншы раз на працягу дня ажно па некалькі разоў.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

«ПАЛЕССЕ» АДКРЫВАЕ ТУРЦЫЮ

ПІНСК. Народны ансамбль танца «Палессе» выехаў у Турцыю. Ён запрошаны на Міжнародны фестываль фальклорнага танца. Самадзейныя артысты з Пінска ўжо з'яўляюцца лаўрэатамі такіх фестываляў у Індыі, Ірландыі, Аргенціне, на Кубе і ў іншых краінах. Да паездкі ў Турцыю падрыхтавана новая праграма, аснову якой складаюць харэаграфічныя кампазіцыі беларускага Палесся.

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

Ідэалагізаванага мяняем на адукаванага

Гутарка з намеснікам міністра адукацыі рэспублікі Васілём СТРАЖАВЫМ

— Рэспубліку, асабліва яе сталіцу, ахапіла сапраўдная эпідэмія па перайменаванню вышэйшых навучальных устаноў. Паводле неправераных дадых, ва універсітэце ці акадэміі плацяць больш, чым у інстытуце...

— Адразу пачну з апошняга. Ніякай розніцы паміж аплатай працы выкладчыка інстытута і універсітэта не існуе. Што ж датычыцца выдзялення нейкіх дадатковых сродкаў на фінансаванне перайменаваных навучальных устаноў, то і тут справа не варта выедзенага яйка. Аб мільёнах гутаркі не вядзецца. Самі ўстановы спраўляюцца са стратамі на замену шыльды на сваім будынку. А дыпломы і так павінны былі замяніць на новыя па той прычыне, што на існуючых стаіць адышоўшы ў нябыт герб СССР. Так што гаварыць аб выкінутых грашах у сувязі з хваляй перайменавання па меншай меры несур'ёзна.

Далей. Нідзе, падкрэсліваю, нідзе ў свеце не існуе вышэйшых навучальных устаноў у выглядзе інстытутаў. Толькі, здаецца, нешта падобнае ёсць у Амерыцы: Масачусецкі політэхнічны інстытут. І гэта выключэнне.

Інстытуты існуюць у замежнай адукацыі, але, напрыклад, у Германіі яны ўяўляюць сабой кафедры ці навукова-даследчыя лабараторыі. І ўсё.

Калі мы хочам інтэгрыраваць у сусветную адукацыйную сістэму, дабіцца таго, каб наш дыплом перастаў быць «драўляным», як рубель, то мы проста павінны кіравацца агульнапрынятымі стандартамі навучання. На Захадзе, ды і ўвогуле ва ўсім свеце найбольш распаўсюджаны універсітэты і акадэміі. Таму адпаведная «хваля» пайшла і ў нас. Больш таго, перакананы: з цягам часу ўсе нашы інстытуты павінны перайменавацца. Праўда, насільна мы нікога не будзем прымушаць.

— Але, згадзіцеся, Васіль Іванавіч, уся гэта кампанія праводзіцца неяк на дзіва штучна. Захацеў — стаў акадэміяй, захацеў — нейкім ледзь не міжнародным адукацыйным цэнтрам.

— Мушу вам запярэчыць. Заявак аб перайменаванні ў міністэрстве сапраўды шмат. Але мы даём «дабро» толькі ў тым выпадку, калі бачым, што гэтая навучальная ўстанова гатовая да пераходу на зусім іншыя рэйкі адукацыі і навукова-даследчай работы.

— Усё ж хацелася б больш падрабязна пачуць пра якасныя змены ў вышэйшай адукацыі рэспублікі.

— Адразу хачу сказаць, што вышэйшая адукацыя залежыць у першую чаргу ад узроўню сярэдняй, ад таго кантынгенту, які мы атрымліваем з сярэдніх навучальных устаноў. Цяпер пра новаўтварэнні.

Радыётэхнічны каледж. Тут можна атрымаць і сярэднюю спецыяльную адукацыю, і вышэйшую. Вядома, на вышэйшую будуць прэтэндаваць сапраўды лепшыя. Чаму такое дзяленне? Ды ў нас проста на многіх прадпрыемствах хапае менавіта сярэдняй адукацыі, ды і далёка не кожны студэнт, як ведаеце, захоча «парыцца» 5 гадоў.

І яшчэ. У нас цалкам адарваная ад вышэйшай сярэдняя адукацыя. Дык вось, менавіта з мэтай карэкціроўкі вучэбных планаў школ і ВНУ і ствараюцца каледжы. Фактычна Мінскае вышэйшае прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча, пасля якога можна ісці на 3 курс політэхнічнай акадэміі, прыраўноўваецца да апошняга.

Пачалі мы «перабудоўваццца», калі ўжыць гэта нямодная цяпер слова, калі ўбачылі, што 50 працэнтаў выпускнікоў ВНУ не працуюць па выбранай спецыяльнасці. Менавіта з гэтай нагоды і ўводзім у ВНУ ступені магістра і бакалаўра ў наступным годзе. Па-першае, гэта сусветная адукацыйная тэрміналогія. Па-другое, раздзяленне накіравана на сапраўды якасна іншы падыход да вышэйшай адукацыі.

Возьмем, політэхнічную акадэмію. Два плюс два гады навучання могуць зрабіць вас бакалаўрам, але для гэтага трэба здаць адпаведныя экзамены. Акрамя добрага ведання спецыяльных дысцыплін, неабходна няблага валодаць замежнай мовай і засвоіць шмат іншых патрэбных па выбранай спецыяльнасці навук.

— А якая ў прынцыпе розніца: бакалаўр ці проста выпускнік політэхнічнай акадэміі?

— Па-першае, у чалавека заўсёды жыве імкненне як мага больш рэалізаваць сябе. Хай гэта праявіцца спачатку ў вучобе. Па-другое, перад вашым будучым босам будзе ляжаць дыплом бакалаўра, што азначае зусім іншы ўзровень спецыяліста з веданнем замежнай мовы, маркетынгу і г. д.

— А калі, напрыклад, я вырашу «абакалаўрыцца» праз некаторы час пасля заканчэння вучобы?

— Калі ласка. Ніхто не будзе чыніць вам перашкод. Адзіны крытэрый — выдатныя веды. Дарэчы, апошні служыць ужо не адзінай умовай для атрымання ступені магістра. Каб ім стаць, трэба закончыць 1—1,5-гадовы цыкл і паспяхова справіцца з кандыдацкім мінімумам. Але тут ужо патрэбны грошы, таму што для кожнага навучэнца на гэтым этапе складаецца індывідуальная праграма. І калі ў вашай далейшай вучобе зацікаўлены завод, хай плаціць грошы ён, калі навукова-даследчы інстытут — гэтая ўстанова. Ну, а калі вы хочаце выехаць, напрыклад, за мяжу з дыпломам аб спецыяльнай вышэйшай адукацыі, тады плаціце ўласныя грошы.

— Ну, а колькасць эліты новага пакалення? І ці не першы гэта званок аб наступленні платнага навучання?

— Не больш чвэрці ўсіх скончыўшых асноўны курс навучання. Калі гаварыць аб платнай адукацыі, то проста мы пакуль не ў стане плаціць за сваю адукацыю. Таму, калі рэспубліка сапраўды зацікаўлена ў новым пакаленні сваіх рулявых, ёй трэба выдаткоўваць адпаведныя грошы. Плацяць хай тыя, хто не трапіў па конкурсу, але ўстанова ўсё ж бярэцца іх вучыць, ну, і завочнікі ў некаторых ВНУ.

Але я цяпер адказваю за дзяржаўную адукацыйную сістэму. Прыватныя навучальныя ўстановы (а такія ўжо ёсць), вядома, існуюць на грошы сваіх навучэнцаў, і нічога дрэннага я ў гэтым не бачу.

— Усё гэта вельмі прыгожа гучыць аб магістрах і бакалаўрах, але для гэтага патрэбна якасна іншая матэрыяльна-тэхнічная база, узровень выкладчыкаў, ну і, нарэшце, жаданне саміх студэнтаў вучыцца.

— Ведаеце, ужо цяпер 11—15 працэнтаў нашых выпускнікоў ВНУ адпавядаюць сусветным стандартам, 60 працэнтам на Захадзе дыпломаў бы не далі, ну, і астатнія 10—15 — павінны былі б не вучыцца ўвогуле. Нам патрэбны быў ідэалагізаваны чалавек, а не адукаваны. І тым не менш, падставы для аптымізму ў вышэйшай школе рэспублікі ёсць. Менавіта гэтыя 10—15 працэнтаў і складаюць патэнцыял нашай адукацыі. А што матэрыяльна-тэхнічная база для яго ёсць, сведчыць той факт, што камп'ютэрным і іншым метадычным забеспячэннем мы цяпер можам нават пахваліцца. І па гэтаму паказчыку мы набліжаемся нават да цывілізаванай Еўропы. Праўда, гэта датычыцца тэхнічных дысцыплін і ўстаноў. Для гуманітарных патрэбны пэўны час.

Што датычыць выкладчыкаў: не за гарамі ўвод кантрактнай сістэмы. Да каго студэнты не будуць хадзіць — звальняем. Усё даволі проста — на першы план выходзіць прафесіяналізм, а не выслуга ў гадах.

Думаю, што цікавасць да высокага адукацыйнага ўзроўню большасць навучэнцаў яшчэ не страцілі, тым больш калі яны будуць ведаць, што з дыпломам, напрыклад, бакалаўра яны могуць прэтэндаваць на больш выгадны кантракт.

— Гуманітарныя, можа, і могуць пачакаць. Але ці выйграе ад гэтага вышэйшая школа, якая пакуль не можа прапанаваць ні падручнікаў, ні курс лекцый па большасці грамадска-палітычных дысцыплін?

— Мы жывём у пераходны перыяд. Тыя падручнікі, якія пішуцца цяпер, напэўна, будуць перапісвацца праз некалькі гадоў. Дык чаму крышку не пачакаць? І чаму абавязкова ўсё зводзіць да чарговай кампаніі? Тым больш, што мы далі большую самастойнасць у вырашэнні гэтага пытання самім ВНУ. Медінстытут узяў і ўвогуле адмовіўся ад гуманітарных дысцыплін. Вядома, першы крок зроблены. Утвораны факультатыўныя курсы па вывучэнню беларускай мовы і гісторыі, ва ўсіх ВНУ ўведзены экзамен па роднай мове.

Стварыўся і савет гуманітарнай перападрыхтоўкі ў інстытуце перападрыхтоўкі. З наступнага года будзем выдаваць гістарычны часопіс, каб хоць самім неяк разабрацца з многімі гістарычнымі пытаннямі. Але, паўтаруся, патрэбен час.

— А каб наладзіць новыя сувязі з цяпер ужо замежнымі калегамі-вучонымі ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Кіеве, які час патрэбен?

— На перагаворах прадстаўнікоў краін Садружнасці пытанне міжадукацыйнага абмену падымалася не раз. Сапраўды, сувязі будуць іншымі, але абмен метадычнай базай і студэнтамі неабходны. Дзяржкамітэт па вышэйшай адукацыі ў Маскве каардынуе гэту дзейнасць.

Мы маем патрэбу ў кінематаграфістах, спецыялістах па цукру і шэрагу іншых. Усяго 20—25 чалавек у год па тых спецыяльнасцях, якім не вучаць у беларускіх ВНУ.

— Маскоўскі камітэт... Ізноў цягнемся да цэнтра?

— Мы першымі ў былым Саюзе адмовіліся ад агульнапрынятых правілаў паступлення ў вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы і ўвялі свае. І яны настолькі добра зарэкамендавалі сябе ў мінулым годзе, што сёлета амаль не змяніліся. Міністэрства нават дало права кожнай ВНУ распрацаваць свой варыянт правілаў, але мала хто адышоў ад нашых тыповых.

Гутарыў
Аляксандр КОКТЫШ.

ВОЗГАЛАС РОЗГАЛАС

НЯМА ВУЗАЎ БОЛЬШ ЦЕСНЫХ, ЧЫМ ТЭХНАЛАГІЧНЫЯ

Эканамічныя сувязі паміж рэгіёнамі Садружнасці павінны наладжвацца, але не традыцыйнымі для савецкай эканомікі сілавымі метадамі, а дзякуючы стварэнню ўмоў для ўзаемнай зацікаўленасці партнёраў. Гэта думка падкрэслівалася пры падпісанні ў Мінску пагаднення аб эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве на 1992—1993 гады паміж Міністэрствам прамысловасці Расіі і Дзяржкамітэтам па прамысловасці і міжгалінавых вытворчасцях Беларусі.

Пагадненне дапаўняе і зацверджаны на сустрэчы пералік канкрэтных прапаноў па стварэнню міждзяржаўных гаспадарчых арганізацый і фарміраванню сумесных мэтавых праграм. Прапанавана, напрыклад, стварыць тэхналагічныя карпарацыі па вытворчасці велікагрузных аўтамабіляў сям'і «БелАЗаў», выпуску складаных радыётэхнічных сістэм, дзесяткі акцыянерных таварыстваў і сумесных прадпрыемстваў, у тым ліку па распрацоўцы і вытворчасці розных машын і абсталявання для вёскі, выпуску медыцынскіх інструментаў, сродкаў касмічнай сувязі, вылічальнай тэхнікі, інтэгральных схем.

(БЕЛТА).

ХТО НЕ ЛЮБІЦЬ «ПАГОНЮ»?

Інстытутам сацыялогіі Акадэміі навук Беларусі праведзена чарговае даследаванне. На гэты раз пытанні распаўсюджваліся сярод вайскоўцаў. На жаль, мы не маем звестак па многіх пунктах анкеты, але некаторыя ўсё ж хацелася б выдзеліць. Яны датычаць у асноўным адносін вайскоўцаў да дзяржаўнага ўладкавання Беларусі. Станоўчыя адносіны да назвы нашай краіны выказала менш як 40 працэнтаў апытаных. А вось яе новыя сімвалы—герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг — ухвалілі толькі каля 18 працэнтаў апытаных афіцэраў.

Цікава, а калі б справа датычылася двухгаловага арла і трохпалоснага расійскага сцяга, то адказы былі б зусім іншыя? У войсках размешчаных на тэрыторыі Беларусі, працэнт вайскоўцаў—выхадцаў з Расіі—складае больш сямідзесяці.

НАЙВЯЛІКШАЕ СВЯТА МУСУЛЬМАН

10 зу-ль-хіджа (чэрвеня) пачынаецца мусульманскае свята Ід-аль-адха, або Ід-аль-кабір, якое ў цюркскіх народаў, у тым ліку і ў беларускіх татараў, называецца Курбан-Байрам. Сёлета ў арабскіх краінах гэтае свята адзначаецца 10 чэрвеня, а ў некаторых іншых мусульманскіх краінах, у тым ліку ў беларускіх татараў, 11 чэрвеня. Святкуецца 3—4 дні. Гэта свята супадае з днём завяршэння хаджы — паломніцтва ў святыя для мусульман месцы—Мекку і Медыну.

Традыцыя гэтага свята ўзыходзіць да вядомага сюжэта аб гатоўнасці Аўраама прынесці свайго любімага сына Ісаака ў ахвяру Богу.

Мусульманскае паданне гаворыць, што першая жонка Ібрагіма — Сара — была бяздзетнай і Ібрагім, параіўшыся з ёю, узяў сабе яшчэ адну жонку — рабыню, егіпцянку Хаджар (у Бібліі Агар). Але не было паміж жонкамі міру і згоды, і калі рознагалоссі зайшлі надта далёка, Ібрагім па патрабаванню Сары адаслаў Хаджар у пустыню паміж Меккай і Іерусалімам. Неўзабаве ў пустыні наложніца нарадзіла сына, але пакутавала без вады, пакутавала разам з ёю і немаўля. Раптам пачула яна голас, які гучаў паміж узгоркамі Сафа і Марва: «Вось вада!» Сем разоў прайшла яна паміж узгоркамі, але безвынікова. І загаласіла яна ў роспачы: «Істамі, я іл, іл». Гэта значыць «Пачуй (мяне), Госпадзі, Госпадзі». Адсюль і паходзіць імя Ісмаіла (у Бібліі — Ізмаіл). Вярнуўшыся на плач Ісмаіла, Хаджар убачыла побач з хлопчыкам чыстую крыніцу. Так было адзначана па волі Алаха гэтае дзіця.

Калі ж Ісмаіл вырас, Ібрагім атрымаў у сне загад Усявышняга прынесці сына ў ахвяру. Ібрагім быў чалавекам богабаязным і не мог не выканаць волю Алаха. Але да Ісмаіла ў чалавечым абліччы з'явіўся шайтан (ібліс) і ўгаворваў не слухацца бацькі. Ісмаіл не згадзіўся. І накіраваўся бацька з сынам да месца ахвярапрынашэння, наканаванага Алахам. І калі яны яго дасягнулі, шайтан зноў з'явіўся перад Ісмаілам і зноў схіляў яго да непакорлівасці. Тады прызнаўся Ісмаіл бацьку свайму, што прыйшоў да яго нейкі чалавек і спакушае яго. Ібрагім жа зразумеў, што гэта шайтан выпрабоўвае сына і загадаў кінуць у ібліса камень. Затым працягнуў Ібрагім руку сваю і ўзяў нож, каб зарэзаць сына свайго. Ен ужо дакрануўся быў да горла Ісмаіла, як Алах сказаў архангелу Джабраілу (у Бібліі Гаўрыілу): «Спяшайся хутчэй да раба майго і перадай яму, каб не падымаў ён рукі на хлопца свайго...» Адным узмахам крылаў Джабраіл дасягнуў зямлі і затупіў нож, перш чым той дакрануўся да горла Ісмаіла.

10 зу-ль-хіджа ва ўсім мусульманскім свеце вернікі аддаюць у ахвяру жывёлу ў памяць пра гатоўнасць Ібрагіма ахвяраваць Алаху свайго сына. Ужо за дваццаць дзён да наступлення Курбан-Байрама не дазваляецца весяліцца, наладжваць застоллі, апранаць новую вопратку, стрыгчыся.

Іншы раз у свята Курбан-Байрам можна бачыць, як прыгатаваных на ахвяру быкоў ці бараноў размалёўваюць фарбамі і ўпрыгожваюць каралямі і бразготкамі. Паводле Ісламу, дарога ў рай праходзіць цераз Сірат-мост, які перакінуты над пякельнай безданнем. Мост гэты танчэйшы за чалавечы волас, вастрэйшы за лязо мяча і гарачэйшы за полымя. Каля ўваходу на Сірат-мост у Судны дзень будуць знаходзіцца жывёлы, прынесеныя ў ахвяру на Курбан-Байрам. На іх будуць прававерныя пераправяцца цераз Сірат-мост у рай. Таму гаспадар стараецца пазначыць уласнага быка або барана, каб хутчэй адшукаць яго ў гэты адказны момант.

Святкаваць дзень ахвярапрынашэння пачынаюць да ўзыходу сонца. Як толькі развіднее, мусульмане ідуць да мячэці на сабах — ранішнюю малітву.

Свята — радасная падзея, таму святочная яда павінна быць смачнай і разнастайнай. Мусульмане Беларусі гатуюць на свята такія традыцыйныя стравы, як калдумы, перакачванікі (пірагі з мясам ці салодкім тварагом), разнастайныя булкі і салаты, кампоты.

У кожнай мусульманскай хаце, кватэры на свята Курбан-Байрам пануе дух такой гасціннасці і шчодрасці, што любы чалавек, увайшоўшы ў мусульманскі дом, не пакаштаваўшы мусульманскай пачостакі, не можа выйсці.

ДЗЕ АДПАЧЫВАЦЬ ПАКУТНІКАМ ЧАРНОБЫЛЯ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

зменшыць яго на працягу двух гадоў можна толькі пры ўмове будаўніцтва новых магутнасцей тут, на Лукомлі, дзе ёсць тэхніка, кадры.

Разумею: ад дырэктара тут нічога або мала што залежыць. Вырашаюць тыя, хто ў Мінску, у тым ліку і ва ўрадзе Рэспублікі Беларусь. Ім жа ўсё адно, дзе будуць тыя блокі: на Лукомлі ці ў нейкім іншым месцы. Важна, каб хутчэй і больш танна. Але гэта ўжо псіхалогія не кіраўнікоў, а жабракоў з торбай: падайце бедным! А вось што сваім такім «саламонавым» рашэннем падпішуць канчатковы прысуд возеру, ім усё роўна. Маўляў, падумаеш, возера! Іх жа сотні ў рэспубліцы. Але возера, як і чалавек, унікальнае. І калі чалавек яшчэ ў стане пакінуць пасля сябе нашчадка, возера памірае аднойчы і назаўсёды.

Паслужлівая памяць зноў і зноў вяртае да малюнка, які, як засведчыла старшыня камітэта «Дзеці Чарнобыля» Тамара Белаокая, быў узноўлены спецыялістамі па стану на 29 красавіка 1986 года. Яго ёй уручылі «зялёныя» ў Галандыі. Злавесная ядзерная хмара вунь як вымазала Белую Русь. Белая,— значыць чыстая. Якая ж яна чыстая, калі ад усёй яе чысціні засталася адна Віцебская вобласць, астатнія пяць у той ці іншай меры забруджаныя? Але ж побач з Браслаўскімі азёрамі — Ігналінская АЭС. А раптам і там «бабахне»? Ці адбудуцца звычайныя «тэхнічныя выкіды»? Куды падацца дарослым? А дзецям?! Іх жа абавязкова трэба вывозіць у чыстую зону хоць на 2—3 месяцы. За мяжу? Але там хутка спадзе жаданне дапамагаць тым, хто пальцам не жадае паварушыць, каб памагчы сабе.

Сапраўды, дзе адпачываць ужо гэтым летам? Значная частка беларускіх здраўніц трапіла пад чарнобыльскі попел. Каўказскія, малдаўскія санаторыі і дамы адпачынку апынуліся ў цэнтры міжнацыянальных канфліктаў, бадай, на гарачай патэльні больш утульна, чым там, дзе свішчуць кулі. На чарзе — і Крым, там таксама неспакойна. Прыбалтыйскія курорты — за пагранічнымі слупамі, і каб адпачыць там, патрэбны «зялёненькія». Дык куды павязём дзяцей? Кошт перавозак узрос у некалькі разоў. Ці не больш зручна і танна наладзіць іх адпачынак у тых чыстых мясцінах, што яшчэ засталіся ў нас, стварыць сетку дзіцячых санаторыяў, дзе юныя пацыенты з зоны маглі б не толькі адпачываць, але і вучыцца? Мясцовыя гаспадаркі ў стане забяспечыць іх чыстымі прадуктамі. Дарэчы, кіраўніцтва Чашніцкага раёна актыўна падтрымала гэтую ідэю. Яе падтрымлівае і Дзяржкамчарнобыль. Цяпер — слова за ўрадам, Вярхоўным Саветам. Пад усю гэтую праграму спатрэбяцца сродкі, і немалыя.

Але найперш — спыніць будаўніцтва трэцяй чаргі Лукомскай ДРЭС, каб уратаваць гэты цудоўны куточак зямлі. Бо хто захоча ўкладваць сродкі ў рэгіён, неба над якім будуць шкодна капціць штодня паўдзесятка высачэзных труб, а возера ператворыцца ў памыйную яму?

Вядома, праблемы дэфіцыту электраэнергіі не абмінуць. Але ж будаваць станцыі можна і на адносна забруджанай тэрыторыі, а энергію падаваць у чыстую зону, шукаць альтэрнатыўныя крыніцы энергіі. А яшчэ лепш — зачыніць шэраг энергаёмістых вытворчасцей і перапрафіляваць іх на выпуск іншай прадукцыі, якая не патрабуе гэтулькі электраэнергіі. Але гэта — ужо асобная тэма.

Уладзімір ГОЙТАН.

КАМЕНТАРЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТА

Г. АНЦЫПАЎ, загадчык аддзела арганізацыі кантролю навукова-тэхнічных праектаў Дзяржкамчарнобыля, кандыдат тэхнічных навук.

На малюнку адлюстравана мяркуемая доза іэатопу ёду-131 (у бэрах) на Беларусі і ў іншых краінах. Гэтыя даныя атрыманы Ліверморскай нацыянальнай лабараторыяй (ЗША) на падставе сярэдняй дозы, назапашанай у шчытападобнай залозе дарослага чалавека за перыяд з 26 красавіка па 1 мая 1986 года.

Дарэчы, аналагічны малюнак надрукаваны ў нядаўна выдадзенай Галоўгідраметам Беларусі брашуры «Чарнобыльскі след на Беларусі».

Такі ж самы характар меў і радыеактыўны след у перыяд да 30 красавіка, калі напрамак ветру змяніўся на паўднёвы і ўсходні.

Трэба адзначыць, што праблема ўзнаўлення доз, атрыманых у першыя дні пасля аварыі, надзвычай складаная. Над гэтым і цяпер працуюць вучоныя многіх краін.

Неабходна ведаць, што асноўная частка дозавай нагрузкі, атрыманая ў першыя дні, была абумоўлена радыенуклідамі з малым часам жыцця, у першую чаргу ёдам-131, колькасць якога змяншаецца напалавіну праз кожныя 8 дзён. Поўнасцю ён распаўся за месяц-другі. І калі паглядзець на карту радыеактыўнага забруджвання сёння, то ў напрамку на паўночны захад ад Мінска няма суцэльнай прасторы са значнай (вышэй 1 кі/км²) шчыльнасцю забруджвання ізатопам цэзію-137.

Ад рэдакцыі:

Амаль два тыдні спатрэбілася, каб пракаменціраваць гэты здымак. Давялося карэспандэнту паблукаць і па калідорах Упраўлення па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, экалагічных праблемах і надзвычайных сітуацыях Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, і па пакоях рэспубліканскага Цэнтра радыяцыйнага кантролю і маніторынгу прыроднага асяроддзя... Усюды быццам бы з разуменнем ставіліся і да праблемы, і да здымка... Але калі даходзіла справа да каментарыя, то... І толькі ў Дзяржкамчарнобылі нарэшце пайшлі насустрач.

У той жа час тым жа Галоўным упраўленнем па гідраметэаралогіі Беларусі днямі выпушчана брашура «Чарнобыльскі след на Беларусі», дзе, як ужо адзначалася ў каментары, змешчаны падобны да гэтага здымак. Да таго ж у брашуры прыведзены даволі трывожныя даныя. У прыватнасці сказана, што «ў выніку катастрофы 23 працэнты тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 3.668 населенымі пунктамі, у якіх пражывае больш за 2 мільёны чалавек, аказаліся забруджаныя радыенуклідамі са шчыльнасцю больш за 1 кі/кв. км (па цэзію-137). Пасля аварыі Беларусь стала зонай экалагічнага бедства. Гэта абумоўлена тым, што новаўтвораныя зоны радыеактыўнага забруджвання супалі ў пэўных рэгіёнах рэспублікі з зонамі высокага хімічнага забруджвання, якія існавалі раней. Радыеактыўнае забруджванне ад Чарнобыля пашырылася па ўсіх абласцях рэспублікі. Але яно мае надзвычай няроўны, «плямісты» характар. Ёсць выпадкі, калі нават на невялікіх плошчах, часам у межах аднаго населенага пункта, суседнічаюць практычна «чыстыя» і моцна забруджаныя ўчасткі...

Вялікая частка насельніцтва ў рэспубліцы вымушана жыць на тэрыторыях з павышанай шчыльнасцю забруджвання радыенуклідамі. У забруджаных зонах і цяпер выкарыстоўваюцца прадукты з асабістых агародаў, што з'яўляецца асноўнай крыніцай паступлення радыенуклідаў у арганізм чалавека і атрымання людзьмі значных дозавых нагрузак не толькі ад вонкавага, але і ад унутранага апрамянвання».

Брашуру можна цытаваць і далей. Але і без таго бачна, што абстаноўка вельмі трывожная. І проста злачынна свядома пагаршаць яе. Чыстыя мясціны, што засталіся яшчэ, трэба ўсяляк аберагаць, ператвараць іх у зоны адпачынку, аздараўлення. Толькі так мы захаваем генафонд нацыі.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

«НЯМЕЦКАЯ ХВАЛЯ»

*** Прэм'ер-міністр Малдовы Валеру Мураўскі і некалькі міністраў яго кабінета падалі ў адстаўку. Матыў — немагчымасць вырашыць прыднястроўскі канфлікт. Выступаючы ў парламенце, прэзідэнт Малдовы Мірча Снегур заявіў, што зробіць спробу назначыць новы ўрад Малдовы да 20 чэрвеня і звярнуўся да міністраў з просьбай працягваць работу да таго часу, пакуль не будзе сфарміраваны новы ўрад.**

*** Пасля ранейшага інтэнсіўнага абстрэлу сталіцы Босніі і Герцагавіны сербскімі сіламі ў Сараева ўсталявалася адносная цішыня. Аднак у некаторых раёнах працягваюцца вулічныя баі.**

*** Прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын заклікаў панаслі канец кроваправаліццю ў Паўднёвай Асеціі, дзе ў апошні час узмацніліся баі. Ельцын прапанаваў стварыць камісію, у саставе якой уключыць прадстаўнікоў усіх зацікаўленых бакоў.**

*** Старшыня Вярхоўнага Савета Расіі Руслан Хасбулатаў заявіў, што Садружнасць Незалежных Дзяржаў пакуль яшчэ не выканала ўмоў кантракту аб продажы Ірану трох падводных лодак звычайнага тыпу. Выступаючы на прас-канферэнцыі ў сталіцы Саудаўскай Аравіі, Хасбулатаў указаў, што гэты кантракт быў заключаны ў часы Гарбачова і пакуль што Іран не атрымаў ніводнай падводнай лодкі. Па ўмовах здзелкі падводныя лодкі павінны былі быць пастаўлены ўжо ў канцы чэрвеня. Але яны яшчэ нават не пабудаваны.**

*** Турцыя пачынае падрыхтоўку дыпламатаў для пяці былых савецкіх рэспублік. Як заявіла турэцкае міністэрства замежных спраў, 29 прафесіянальных дыпламатаў з Азербайджана, Казахстана, Кыргызстана, Узбекістана і Туркменістана прыбудуць 16 чэрвеня ў Анкару для праходжання месячных курсаў падрыхтоўкі. Турцыя мяркуе таксама пачаць падрыхтоўку банкаўскіх служачых, менеджэраў для краін, што маюць з ёй агульныя этнічныя, рэлігійныя і культурныя традыцыі.**

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

*** У адным з раёнаў дзелавога цэнтра Кабула адбыўся выбух, у выніку якога загінулі чатыры чалавекі. Узарвалася граната, якую выпадкова згубілі каля аднаго з рынкаў.**

*** Зноў грымяць баі на граніцы паміж Арменіяй і Азербайджанам. Пазаўчора тут загінулі 9 чалавек.**

*** Вярхоўны Савет Літвы адмовіўся прыняць адстаўку прэм'ер-міністра Вагнюруса. Толькі 51 дэпутат прагаласаваў за прыняцце адстаўкі, 46 — супраць, 5 — устрымаліся, а 5 дэпутатаў не прынялі ўдзелу ў галасаванні. Вагнюрус падаў у адстаўку ў маі, абвінаваціўшы Вярхоўны Савет у стварэнні перашкод ягонай праграме рэформ. Ен назваў дэпутатаў ад апазіцыі камуністычным блокам.**

*** Міністр абароны Расіі Павел Грачоў заявіў, што Расія вырашыла стварыць сілы хуткага рэагавання. У іх саставе ўвойдуць дэсантныя падраздзяленні і транспартныя самалёты. Гэтыя сілы будуць перакідвацца ў ачагі напружання для хуткага ўрэгулявання канфліктаў. Грачоў зазначыў, што ў склад сіл увойдуць і некалькі матарызаваных пяхотных брыгад. Ен указаў, што буйнае звяно новых сіл складуць хутчэй за ўсё вайскоўцы, якія вяртаюцца на радзіму з Усходняй Германіі і Закаўказзя. Наколькі яны будуць вялікія і дзе базіравацца, міністр не паведаміў.**

РАДЫЁ «СВАБОДА»

*** Міністр абароны ФРГ Руэ заявіў, што Германія прыступіць да аднабаковага скарачэння зброі з тым, каб пераканаць былыя рэспублікі СССР у неабходнасці хутчэйшай ратыфікацыі Дагавора па скарачэнню звычайных узбраенняў у Еўропе. Руэ паведаміў журналістам у Берліне, што дзесяць тысяч баявых сістэм будуць ліквідаваны ў якасці жэста добрай волі. Паводле яго слоў, Германія закончыць ліквідацыю ў сярэдзіне года — пасля кансультацыі з саюзнікамі па НАТО. Дагавор па скарачэнню звычайных узбраенняў быў падпісаны краінамі — членамі НАТО і Варшаўскага Дагавора ў 1990 годзе, аднак не ўступіў пакуль у сілу ў выніку распаду СССР і Варшаўскага Дагавора.

*** Лідэр партыі «Х», былы сапернік Леха Валенсы на пост прэзідэнта Польшчы, грамадзянін трох дзяржаў свету Станіслаў Тымінскі папярэдзіў кіраўніка польскай дзяржавы, што раскрые сакрэты свайго «чорнага партфеля», калі той неадкладна не пойдзе ў адстаўку. Як паведамляюць сусветныя інфармацыйныя агенцтвы, Тымінскі, баючыся пакушэння на сябе, раніцай 7 чэрвеня пакінуў Польшчу.**

*** Судовыя ўлады Федэратыўнай Рэспублікі Германія прад'явілі былому кіраўніку камуністычнага рэжыму ГДР Эрыху Хонекеру новыя абвінавачанні. На гэты раз — у растратах і раскраданні. Устаноўлена, што ў 1988 і 1989 гадах Хонекер і яго прыбліжаныя патрацілі 9,6 мільёна долараў на набыццё каштоўных заходніх тавараў для асабістага карыстання. Аб гэтым паведаміла агенцтва Рэйтэр.**

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

interfax ИНТЕРФАКС паведамляе

У ТБІЛІСІ УЗМАЦНЯЮЦЦА МЕРЫ СУПРАЦЬ ЗЛАЧЫННАСЦІ

Паводле паведамлення МУС Грузіі, з аўторка ў Тбілісі пачата сумеснае патруляванне дарог і ўездаў у горад міліцыяй, аўтаінспекцыяй і нацыянальнай гвардыяй. Гэта мера прынята ў мэтах узмацнення барацьбы са злачыннасцю, у тым ліку з бону ўзброеных груповак.

ВА УЗБЕКІСТАНЕ ФАРСІРУЮЦЬ УКАРАНЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ МОВЫ

Пытанні ўкаранення ў жыццё закона Узбекістана аб дзяржаўнай мове разгледжаны на пасяджэнні, якое прайшло ў аўторак у Кабінеце Міністраў рэспублікі.

На пасяджэнні адзначалася, што да гэтага часу нават у вышэйшых інстанцыях Узбекістана слаба мяняюцца адносіны да дзяржаўнай мовы. У якасці негатыўнага быў прыведзены факт, што некаторыя рашэнні і ўказы спускаюцца на месцы на рускай мове.

ДЭМАКРАТЫ РЫХТУЮЦЦА ДА ПРАВЯДЗЕННЯ ЎСЕРАСІЙСКАГА РЭФЕРЭНДУМУ

У аўторак у Маскве адбыўся сход дэмакратычна настроеных грамадзян па вылучэнню ініцыятыўнай групы для правядзення ўсерасійскага рэферэндуму. Як паведамляе наш карэспандэнт, на ім рэзкай крытыцы падверглася пазіцыя тых дэмакратычных партый, якія не падтрымалі ідэю плебісцыту. На яго вырашана вынесці пытанні аб прыватнай уласнасці на зямлю, аб праве прэзідэнта аб'яўляць рэферэндум, а таксама аб прынцыпі новай Канстытуцыі не з'ездам народных дэпутатаў РФ, а ўстаноўчым сходам.

Аляксандр Кісялёў, старшыня выканкома расійскага Руху дэмакратычных рэформ, у інтэрв'ю карэспандэнту «Інтэрфакса» выказаў спачуванне ў сувязі з адмовай Народнай партыі «Свабодная Расія» (А. Руцкога), Дэмакратычнай партыі Расіі (М. Траўкіна) і саюза «Абнаўленне» (А. Вольскага і А. Уладзіслаўлева) падтрымаць правядзенне рэферэндуму.

ДЭПУТАТЫ АД ПРЫДНЯСТРОЎЯ ПРАПАНУЮЦЬ КІШЫНЁВУ ПРАЕКТ ДЗЯРЖАЎНАГА УЛАДКАВАННЯ

Дэпутаты ад Прыднястроўя маюць намер унесці на разгляд парламента Малдовы, сесія якога адкрылася ў Кішынёве ў аўторак, два праекты пастановы — «Аб спыненні ваеннага канфлікту ў Прыднястроўі» і «Аб дзяржаўным уладкаванні Рэспублікі Малдова». Аб гэтым паведамілі «Інтэрфаксу» ў прэс-цэнтры ўрада Прыднястроўя.

ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

Бацька ў мяне татарын, а маці — беларуска. Вельмі хацеў бы памяняць імя па бацьку, але не ведаю, ці магчыма гэта?

Я. ГРАМЫКА.

г. Магілёў.

Мая дачка запісана як Аксана, але амаль уся завуць яе Ксеніяй. Як можна памяняць імя ў дакуменце?

Л. ПРОЦКАЯ.

Мінскі раён.

З верасня мінулага года на Беларусі дзейнічае закон, згодна з якім мяняць прозвішча, імя і імя па бацьку грамадзяне могуць ужо з 16 гадоў, а не з 18, як раней. Дзеля гэтага трэба звярнуцца з пісьмовай заявай у ЗАГС па месцы жыхарства. Бацькі мяняюць імёны дзецям да спаўнення ім 5 гадоў, калі іх завуць інакш, чым запісана ў пасведчанні аб нараджэнні. Патрэбы ў змене імя, імя па бацьку і прозвішча ў апошні час узнікаюць усё часцей, што тлумачыцца немілагучнасцю, жаданнем мужа і жонкі насіць агульнае прозвішча, нацыянальнымі прычынамі і, асабліва, астралогіяй, якая так актыўна увайшла ў наша жыццё. Дарэчы, спіс імёнаў, якія сёння даюцца народжаным, не вельмі вялікі. Менш стала Святлан, Ігараў, зніклі Акцябрыны, Алімпіяды, Уладлены і Кімы, затое ўсё больш Настассяў, Палін, Ксеній, Мікіт, Арцёмаў, Мацвеяў.

Генеральны дырэктар, дарэчы, застрахаваны

Здаецца, усе памятаюць шырокамаштабную акцыю на плошчы Незалежнасці страхоўшчыкаў нізавых звенняў супраць міраўніцтва Белдзяржстраха і персанальна яго генеральнага дырэктара Пятра Стасюка. Апошняга абвінавачвалі ў фінансавых (у тым ліку валютных) махінацыях, злоўжыванні службовым становішчам у асабістых мэтах і карупцыі. У сувязі з гэтым цікава было б даведацца, ці застрахаваны сам Пётр Стасюк, дзе і ад чаго?

В. ЛАМЕКА.

Мінскі раён.

Паводле слоў генеральнага дырэктара Белдзяржстраха Пятра Стасюка, ён застрахаваўся 30 гадоў назад, калі яшчэ не працаваў у сістэме дзяржаўнага страхавання. Цяпер у яго застрахаваны жыццё, дача, маёмасць на дачы, маёмасць у кватэры, машына і ўся яго сям'я. Пётр Стасюк, аднак, зазначыў, што па так званых страхавых выпадках страхоўку за ўсё жыццё ні разу не атрымліваў.

«КІШЭНЯ» ААН:

— Цікава даведацца, якія ўзносы плацяць у ААН дзяржавы, што раней уваходзілі ў саставу СССР?

ЛІСАВЫ.

г. Мінск.

Адказ на гэта пытанне мы атрымалі ў дэпартаменце інфармацыі і друку МЗС Расійскай Федэрацыі, які валодае на сённяшні момант найбольш дакладнымі данымі.

Узнос Расіі ў ААН устаноўлены ў размеры 9,41 працэнта, Украіны—1,18 працэнта, Беларусі—0,31 працэнта ад агульнага бюджэту ААН (0,01 працэнта роўна прыкладна 100 тысячам долараў).

Стаўкі Літвы, Латвіі і Эстоніі ў адпаведнасці з рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі

ХТО БОЛЬШ?

ААН будуць вызначаны на 32-й сесіі Камітэта ААН па ўзносах, пасля чаго іх вылічаць са стаўкі Расійскай Федэрацыі, якая адпаведна стане меншай, чым цяперашнія 9,41 працэнта. Сумы да выплаты будуць налічвацца з моманту прыняцця гэтых трох дзяржаў Балтыі ў саставу ААН. Па астатніх дзяржавах, якія ўваходзілі ў саставу СССР, стаўкі яшчэ не вызначаны, але на іх, відавочна, будзе распаўсюджана тая ж сістэма.

Палавіну ўзносу за 1991 год былы СССР (уключаючы Беларусь і Украіну) заплаціў. Агульная сума склала без малога 53 мільёны долараў. Але не трэба забываць і пра другую палавіну... Скаргі на «пустыя кішэні» ў сусветным супольніцтве не праходзяць.

Кірмашы, кірмашы

Кажуць, што да рэвалюцыі 1917 года ў Беларусі праводзілася вельмі шмат гандлёвых кірмашоў, якія праходзілі кожны год у адны і тыя ж дні. У наш час гэтыя традыцыі амаль страчаны. Раскажыце, калі ласка, калі адбываліся кірмашы, напрыклад, у буйных гарадах Беларусі.

С. ГАЛУЗА.

г. Лоеў.

Сапраўды, на тэрыторыі нашай рэспублікі ў так званыя «дакастрычніцкія» часы дзейнічалі кірмашы ў многіх гарадах і вёсках. Прычым традыцыйна кожны год яны праходзілі ў адны і тыя ж дні, у якія быццам бы Бог найбольш спрыяў гандлёвым здзелкам. Прыводзячы спіс найбольш буйных кірмашоў Беларусі, спадзяёмся, што традыцыі іх правядзення будуць адноўлены ў поўным аб'ёме. Заўважым, што ўсе даты прыведзены па старому стылю, таму да іх трэба прыбаўляць трынаццаць дзён.

Бераставіца — 6 мая (конскі кірмаш).
Беразіно — з 6 па 9 жніўня.
Бабруйск — 1 студзеня, 9 мая і 1 кастрычніка.
Бешанковічы — 29 чэрвеня.
Быхаў — на першым тыдні Вялікага паста, на дзесятым тыдні пасля Вялікадня і на апошнім тыдні Вялікага паста.
Гомель — з 1 па 8 студзеня, у дзень Сашэсця Святога Духа, і з 14 па 16 верасня.
Гродна — з 26 чэрвеня па 26 ліпеня.
Гальшаны — 23 красавіка і 24 чэрвеня.
Даўгінава — 20 і 21 мая.
Друя — з 6 па 10 студзеня і ў першую нядзелю Вялікага паста (на працягу 3 дзён).
Дзвінск — з 25 снежня па 7 студзеня і з 6 па 26 чэрвеня.
Жлобін — з 1 па 15 кастрычніка.
Зэльва — з 25 ліпеня па 25 жніўня.
Крэва — 9 мая і 1 кастрычніка.
Кобрын — з 6 па 31 студзеня.
Койданава — 1 лютага, 23 красавіка, 8 і 18 мая, 20 ліпеня і 1 кастрычніка.
Лоеў — на дзесятым тыдні пасля Вялікадня.
Лужкі — 24 студзеня і 8 верасня.
Люцын — з 12 лютага і з 15 жніўня (па два тыдні).
Мінск — з 25 мая па 25 чэрвеня.
Мір — з 9 мая чатыры панядзелкі запар, з 6 снежня.
Мазыр — 6—27 студзеня, 6—28 жніўня.
Магілёў — 10—18 снежня, з 29 чэрвеня па 2 ліпеня (конскі), 15—24 ліпеня.
Орша — 9 мая (нікольскі).
Асвея — у пятніцу перад Пятровым днём, 24 ліпеня і ў дзень Ушэсця.
Ашмяны — 23 красавіка і 29 верасня.
Нясвіж — з 13 па 17 верасня.
Навагрудак — 19 сакавіка.
Парычы — з 14 па 22 кастрычніка.
Петрыкаў — 20 ліпеня і 1 кастрычніка.
Пінск — у дзень Сашэсця Святога Духа, на дзесятым тыдні пасля Вялікадня і з 12 па 16 чэрвеня.
Полацк — у дзень Прападобнай Ефрасінні.
Пухавічы — 9 мая і 6 снежня.
Рэчыца — з 9 па 23 мая і з 6 па 26 снежня.
Радашковічы — з 6 па 9 мая.
Свіслач — 26 жніўня.
Смаргонь — з 15 па 18 студзеня, і ў сярэдзіне Вялікага паста; з 11 па 12 сакавіка; 20 жніўня — 1 верасня, з 8 па 29 верасня.
Стоўбцы — 6 сакавіка.
Тураў — 10 лютага, 25 чэрвеня.
Чавусы — георгіеўскі 23 красавіка, 26 лістапада і на першым тыдні Вялікага паста.
Чэрыкаў — на першым тыдні Вялікага паста, на Сёмуху, 1 кастрычніка і 10 снежня.
Шклоў — на другім тыдні Вялікага паста і на дзевятым тыдні пасля Вялікадня.
Хойнікі — 2 лютага і 1 кастрычніка.
Шчучын — з 15 ліпеня і з 15 кастрычніка (па месяцу).

Генеральны дырэктар, дарэчы, застрахаваны

Здаецца, усе памятаюць шырокамаштабную акцыю на плошчы Незалежнасці страхоўшчыкаў нізавых звенняў супраць міраўніцтва Белдзяржстраха і персанальна яго генеральнага дырэктара Пятра Стасюка. Апошняга абвінавачвалі ў фінансавых (у тым ліку валютных) махінацыях, злоўжыванні службовым становішчам у асабістых мэтах і карупцыі. У сувязі з гэтым цікава было б даведацца, ці застрахаваны сам Пётр Стасюк, дзе і ад чаго?

В. ЛАМЕКА.

Мінскі раён.

Паводле слоў генеральнага дырэктара Белдзяржстраха Пятра Стасюка, ён застрахаваўся 30 гадоў назад, калі яшчэ не працаваў у сістэме дзяржаўнага страхавання. Цяпер у яго застрахаваны жыццё, дача, маёмасць на дачы, маёмасць у кватэры, машына і ўся яго сям'я. Пётр Стасюк, аднак, зазначыў, што па так званых страхавых выпадках страхоўку за ўсё жыццё ні разу не атрымліваў.

Хопіць працаваць «на дзядзьку»

Як паведамляла «Звязда», адбылася прэс-канферэнцыя старшыні Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Станіслава Багданкевіча па пытаннях плацежнага крызісу ў эканоміцы рэспублікі. Адной з мер яго пераадолення было названа ажыццяўленне 1 ліпеня г. г. узаемнага заліку запазычанасцей унутры Беларусі і паміж рэспублікамі.

Механізм аперацыі ў агульных рысах такі: наш МТЗ павінен пастаўшчыкам за межамі рэспублікі прыблізна 1 мільярд рублёў. Але і яму ў краінах Садружнасці завінаваціліся за яго прадукцыю каля мільярда. Вось гэтыя сумы і пойдуць у залік. Умовы правядзення заліку яшчэ будуць карэкціравацца, але пагадненне аб ім альбо прынцыповая дамоўленасць у Нацыянальнага банка і ўрада Беларусі з іх партнёрамі ўжо дасягнуты.

Паўстае пытанне: ці выгадная нам такая ліквідацыя ўзаемных фінансавых прэтэнзій? Станіслаў Антонавіч сцвярджае, што выгадна. Па-першае, Беларусі іншыя рэспублікі вінны на 15 мільярдаў рублёў больш, чым яна ім. Па-другое, трэба як мага хутчэй спыніць існуючую заганную практыку. Бо што атрымліваецца? Вытворца вырабляе тавар і адпраўляе спажыўцу. Той тавар атрымлівае і не аплачвае. Грошы да вытворцы не вяртаюцца. Але яму трэба плаціць зарплату рабочым, закупляць сыравіну і абсталяванне. Тады ён ідзе ў банк і патрабуе крэдыт, каб вытворчасць не спынілася. Банк дае. Пасля заканчэння новага вытворчага цыкла ўсё паўтараецца.

Мы ўвесь час гнарымся, што ў Беларусі самыя нізк

РАСКЛАД РУХУ
ПРЫГАРАДНЫХ ПАЯЗДОЎ ПА СТАНЦЫІ МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ
НА ЛЕТНІ ПЕРЫЯД

Станцыя прызначэння	Час адпраўлення
БАРЫСАЎ	3.50 з прып. на ст. Мінск-Усходні, Сцяпянка, Калодзішчы, Гарадзішча, Смалявічы, Чырвоны сцяг, Жодзіна
КРУПКІ	5.30, 9.12* без прып. на п. п. Таварны двор
БАРЫСАЎ	8.41, 10.01*, 16.09, 17.13, без прып. на п. п. Таварны двор
ПРЫЯМІНА	16.41 без прып. на п. п. Таварны двор
СТОЎБЦЫ	0.52 без прып. на п. п. Энергетык, 806 км, Мязінаўка, Атцэда, Кучкуны
БАРАНАВІЧЫ	0.52 (па суботах) да ст. Стоўбцы без прып. на п. п. Энергетык, 806 км, Мязінаўка, Атцэда, Кучкуны, далей з прып. на станцыях Гарадзея, Пагерэльцы
БАРАНАВІЧЫ	1.09 з прып. на ст. Курасоўшчына, Памыслішча, Фаніпаль, Койданава, Негарэлае, Коласава, Стоўбцы, Гарадзея
БАРАНАВІЧЫ	4.49 без прып. на п. п. Рошча, Клыпаўшчына, Энергетык, 806 км, Мязінаўка, Атцэда, Кучкуны
СТОЎБЦЫ	5.49, 6.40, 7.32*, 7.50, 8.15*, 9.19, 10.00*, 12.08**, 12.39, 13.58, 15.03, 17.32, 18.27, 20.22 з усімі прыпынкамі
БАРАНАВІЧЫ	8.39, 10.30, 11.18*, 16.16, 19.27, 21.06 з усімі прыпынкамі
БАРАНАВІЧЫ	13.07 без прып. на п. п. Бярэжа, Станькава, Клыпаўшчына, Энергетык, 806 км, Мязінаўка, Атцэда, Кучкуны
БАРАНАВІЧЫ	14.30** без прып. на п. п. Піч, Волкавічы, Бярэжа, Станькава, Клыпаўшчына, Энергетык, 806 км, Мязінаўка, Атцэда, Кучкуны
БАРАНАВІЧЫ	17.06 без прып. на п. п. 806 км, Мязінаўка
НЕГАРЭЛАЕ	18.00**, без прып. на п. п. Бярэжа, Станькава, Клыпаўшчына
НЕГАРЭЛАЕ	20.58* без прып. на п. п. Бярэжа, Станькава
БАРАНАВІЧЫ	21.43** без прып. на п. п. Бярэжа, Станькава, Клыпаўшчына, 806 км, Мязінаўка, Юшкевічы, Перамога, Крошына, пост № 1
СТОЎБЦЫ	22.22 без прып. на п. п. 806 км, Мязінаўка
СТОЎБЦЫ	23.35 без прып. на п. п. Энергетык, 806 км, Мязінаўка, Атцэда, Кучкуны
ПУХАВІЧЫ	0.05, 6.27*, 7.31*, 8.40*, 13.14*, 18.12, 19.03**, 20.27, 21.36, 22.38 з усімі прыпынкамі
АСІПОВІЧЫ	1.14 без прып. на п. п. Весялоўскі, Вярхі, Савецкі, Юбілейны
АСІПОВІЧЫ	3.52 з прып. на ст. Мінск-Паўднёвы, Калядзічы, Асеўка, Міханавічы, Рудзенск, Пухавічы, Талька, Вярэйцы
АСІПОВІЧЫ	5.00, 5.59, 6.59, 7.48, 8.25, 9.13, 9.56*, 10.20*, 11.38, 12.30, 14.19, 16.36, 17.26, 19.14, 21.12 без прып. на п. п. Савецкі
РУДЗЕНСК	7.19*, 20.53* з усімі прыпынкамі
АСІПОВІЧЫ	8.08* без прып. на п. п. Мачулішчы, Новае Сяло, Дрычын, Вендзеж, Тэхнікум, Вяленскі, Блужа, Вярхі, Савецкі
ТАЛЬКА	8.15, 10.56*, 13.49, 15.30, 16.29**, 17.06, 18.37, 19.55* з усімі прыпынкамі
АСІПОВІЧЫ	9.05* без прып. на п. п. Рыбцы, Дрычын, Вендзеж, Вяленскі, Блужа, Вярхі, Савецкі
АСІПОВІЧЫ	11.18* без прып. на п. п. Зазеркі, Рыбцы, Раўнаполле, Новае Сяло, Дрычын, Вендзеж, Тэхнікум, Вяленскі, Блужа, Савецкі
ПУХАВІЧЫ	16.10* без прып. на п. п. Новае Сяло, Дрычын, Вендзеж
ПУХАВІЧЫ	16.48** без прып. на п. п. Вендзеж
ПУХАВІЧЫ	17.38* без прып. на п. п. Зазеркі, Рыбцы, Новае Сяло, Дрычын, Вендзеж, Тэхнікум
ТАЛЬКА	19.40** без прып. на п. п. Новае Сяло, Дрычын, Вендзеж
АСІПОВІЧЫ	22.02 без прып. на п. п. Весялоўскі, Савецкі
АЛЯХНОВІЧЫ	0.18 (штодзённа) без прып. на п. п. Анусіна, Пралескі
МАЛАДЗЕЧНА	1.20 (штодзённа) без прып. на п. п. Мінскае мора, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Ласі, Крыніца, Селіванаўка
МАЛАДЗЕЧНА	4.04 (штодзённа) да ст. Аляхновічы без прыпынкаў, далей з усімі прыпынкамі
АЛЯХНОВІЧЫ	4.20 (рабоч. дні) без прып. на п. п. Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы
МАЛАДЗЕЧНА	4.31 (штодзённа) без прып. на п. п. Мінскае мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі
МАЛАДЗЕЧНА	5.36, 6.41, 8.23, 9.03, 10.07, 10.48, 11.43, 12.37, 13.48, 15.47, 16.26, 16.59, 17.57, 18.42, 20.12, 20.57 (пераліченыя электрапаязды ідуць толькі ў рабочыя дні), 21.55 штодзённа, 23.06 штодзённа з усімі прыпынкамі
БЕЛАРУСЬ	6.08 (штодзённа), 7.07 (штодзённа), 16.05 (па пятн.) з усімі прыпынкамі
АЛЯХНОВІЧЫ	7.37 (штодзённа), 15.39 (у рабочыя дні), 17.08 (па пятн.), 17.26 (у рабочыя дні), 18.51 (па пятн.), 19.26 (у рабочыя дні), 20.03 (па пятн.) з усімі прыпынкамі
МАЛАДЗЕЧНА	14.31 (па пятн), без прып. на п. п. Мінскае мора, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Раманы
МАЛАДЗЕЧНА	15.28 (па пятн.) без прып. на п. п. Мінскае мора, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы
МАЛАДЗЕЧНА	17.49 (па пятн.) без прып. на п. п. Мінскае мора, Хмелеўка
УША	19.08 (па пятн.) з усімі прыпынкамі

ЗОННЫ ГРАФІК РУХУ ЭЛЕКТРАПАЯЗДОЎ НА ЎЧАСТКУ МІНСК—МАЛАДЗЕЧНА ПА СУБОТАХ І НЯДЗЕЛЯХ З 7 ГАДЗІН 28 ХВІЛІН ДА 21 ГАДЗІНЫ 26 ХВІЛІН

АЛЯХНОВІЧЫ	6.36 без прып. на п. п. Радыятарны, Мінскае мора
МАЛАДЗЕЧНА	7.28 без прып. на п. п. Мінскае мора, Ратамка, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы
АЛЯХНОВІЧЫ	7.37, 8.10, 8.46, 9.18, 18.35, без прып. на п. п. Мінскае мора, Крыжоўка, Зялёнае
БЕЛАРУСЬ	7.46, 8.18, 8.53, 9.30, 16.08, 18.03, 20.00, 20.32, 21.06 з усімі прыпынкамі
МАЛАДЗЕЧНА	8.01, 8.36, 9.09, 9.46, 16.30, 16.58, 17.42, 18.19 без прып. на п. п. Жденовічы, Мінскае мора, Ратамка, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы
АЛЯХНОВІЧЫ	10.01, 10.32, 11.03, 11.43, 12.38, 13.35, 14.14, 14.37, 15.18, 15.39, 16.35 з усімі прыпынкамі
МАЛАДЗЕЧНА	10.24, 10.54, 11.25, 12.28, 13.07, 13.55, 14.56, 15.57, 20.13 (без прып. на п. п. Мінскае мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы)
МАЛАДЗЕЧНА	14.27 без прып. на п. п. Мінскае мора, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Раманы
МАЛАДЗЕЧНА	15.31 без прып. на п. п. Мінскае мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Раманы
АЛЯХНОВІЧЫ	17.11, 18.35, 20.57 без прып. на п. п. Мінскае мора, Крыжоўка, Зялёнае
БЕЛАРУСЬ	17.24, 19.08 без прып. на п. п. Радыятарны
АЛЯХНОВІЧЫ	17.51 без прып. на п. п. Мінскае мора, Крыжоўка
АЛЯХНОВІЧЫ	18.47 без прып. на п. п. Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы
МАЛАДЗЕЧНА	19.00 без прып. на п. п. Мінскае мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна
АЛЯХНОВІЧЫ	19.26 без прып. на п. п. Жденовічы, Мінскае мора, Ратамка, Крыжоўка, Зялёнае, Пралескі, Раманы
АЛЯХНОВІЧЫ	19.36 без прып. на п. п. Мінскае мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка
АЛЯХНОВІЧЫ	20.22 без прып. на п. п. Мінскае мора, Зялёнае
МАЛАДЗЕЧНА	20.39 без прып. на п. п. Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы
ДУБРАВЫ	21.26 без прып. на п. п. Хмелеўка, Анусіна

АДПРАЎЛЕННЕ СА СТАНЦЫІ МІНСК-ПАЎДНЁВЫ

РУДЗЕНСК	19.37 прып. на ст. Калядзічы, Мачулішчы, Асеўка, Міханавічы

АДПРАЎЛЕННЕ З П. П. «ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ»

НЕГАРЭЛАЕ	19.46* з усімі прыпынкамі
ОРША	0.41 без прып. на п. п. Таварны двор, Дамашаны, Барсукі, Пралетарская Перамога
ОРША	6.27, 11.07 без прып. на п. п. Таварны двор
КРУПКІ	7.15 з усімі прыпынкамі
БАРЫСАЎ	8.05, 10.46, 12.45, 21.36, 23.51 без прып. на п. п. Таварны двор
ЖОДЗІНА	8.18*, 11.51*, 14.05** без прып. на п. п. Таварны двор
ОРША	9.03* без прып. на п. п. Таварны двор, Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е, Зарэчнае, Барсукі, Жодзіна, Паўднёвае, Пралетарская Перамога, Пячынскі, Беразіна, Неманіца, Замужанне, Бережок, Новае жыццё, Красноўка, Трацыпава, Чырвоная Горка
ТАЛАЧЫН	9.41* без прып. на п. п. Таварны двор
ОРША	13.36 без прып. на п. п. Таварны двор, Дамашаны, Загор'е, Барсукі, Пралетарская Перамога, Беразіна, Неманіца, Замужанне, Красноўка, Чырвоная Горка, Перавалачны, Галашэўка, Верабейша
СЛАЎНАЕ	14.29 без прып. на п. п. Таварны двор
ОРША	15.14 без прып. на п. п. Таварны двор, Слабада, Дамашаны, Загор'е, Барсукі
ЖОДЗІНА	17.20** без прып. на п. п. Таварны двор, Загор'е, Барсукі
ПРЫЯМІНА	17.57 без прып. на п. п. Таварны двор, Беразіна, Неманіца, Замужанне
ОРША	18.37 без прып. на п. п. Таварны двор, Галашэўка
БАРЫСАЎ	19.25 з усімі прыпынкамі
ОРША	20.42 без прып. на п. п. Таварны двор, Пралетарская Перамога, Пячынскі, ад ст. Барысаў з прыпынкамі на станцыях Навасады, Прыяміна, Крупкі, Бобр, Слаўнае, Талачын, Коханава
ПРЫЯМІНА	22.44 без прып. на п. п. Таварны двор, Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е, Барсукі, Пралетарская Перамога
ОРША	23.51 (па пятн.) без прып. на п. п. Таварны двор, ад станцыі Барысаў з прыпынкамі на ст. Навасады, Прыяміна, Крупкі, Бобр, Слаўнае, Талачын, Коханава

ЗАЎВАГІ:

а) * ля часу адпраўлення электрапаяздоў, якія курсіруюць толькі ў выхадныя і святочныя дні.

б) ** ля часу адпраўлення электрапаязду, які курсіруюць толькі ў пятніцу, выхадныя і святочныя дні.

Усе астатнія электрапаязды штодзённага курсіравання.

Зельнік

ГАСПАДАРЧАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ

У ГАСПАДАРЦЫ з сушаных пладоў ажынаў атрымліваюць фіялетавы фарбавальнік, высаджваюць для замацавання яроў, схілаў, выкарыстоўваюць для селекцыі зімаўстойлівых сартоў маліны.

СТРАВЫ З АЖЫНАЎ

У ХАРЧАВАННІ выкарыстоўваюць ягады і лісце ажынаў. З ягад вараць варэнне, джэм, кампот, пасцілу, робяць начынкі ў пірагі, салаты. З лісця гатуюць сурагат чаю.

Салата з ажынамі. Ягады ажынаў разрэзаць напалам, яблыкі здрабніць на тарцы, агрэст ці вінаград ачысціць ад костачак, парэчкі — ад чаранкоў, слівы разрэзаць на 4 часткі. Усё пакласці слаямі ў салатніцу і заправіць смятанным соусам з цукрам ці ягадным сокам.

400 г ажынаў, 200 г сліў, 200 г чырвоных парэчак, 150 г агрэсту ці вінаграду, 150 г яблыкаў, 400 г соусу смятаннага ці сіропу ягаднага.

Кампот з ажынаў. Ягады раскласці ў стэрылізаваныя слоікі, заліць гарачым цукровым сіропам, накрыць накрыўкамі і стэрылізаваць: паўлітровыя 15, літровыя — 20 хвілін. Слоікі закупорыць.

1 кг ажынаў, 300—400 г цукру, 1 л вады.

Кісель з ажынаў. Ягады працерці праз сіта, увесці іх у кіпячы салодкі раствор крухмалу, добра размяшаць, давесці да кіпення.

200 г ягад, цукар і крухмал па смаку, 500 мл вады.

Мармелад з ажынаў. Ягады нагрэць, расцерці, адціснуць сок і гатаваць на слабым агні да выпарвання палавіны першапачатковага аб'ёму, затым дадаць цукар і варыць да неабходнай кансістэнцыі. Мармелад парэзаць на кавалачкі і падсушыць на пергаментнай паперы.

1 кг ягад, 350 г цукру.

Пасціла з ажынаў. Ягады добра прапарыць у духоўцы, працерці праз сіта, змяшаць з цукрам і варыць на слабым агні да гушчыні жэле. Масу разліць у формачкі, запячы ў духоўцы, затым астудзіць, пасыпаць цукрам ці цукровай пудрай.

1 кг ажынаў, 500 г цукру.

Варэнне з ажынаў. 1. Ягады перабраць, выдаліць пладаножкі, заліць цукровым сіропам на 4—6 гадзін. Затым сіроп зліць, давесці да кіпення, астудзіць, пакласці ў яго ягады і варыць на слабым агні да гатоўнасці.

1 кг ажынаў, 1 кг цукру, 300 мл вады.

2. Ягады перабраць, спаласнуць халоднай вадой, засыпаць цукрам і паставіць у халаднаватае месца на 10—12 гадзін. Затым варыць на моцным агні 20 хвілін, раскласці ў гарачыя слоікі і вытрымаць іх у гарачай вадзе 2 гадзіны.

1 кг ажынаў, 1 кг цукру.

Сіроп з ажынаў. Спелыя ягады перабраць, адціснуць сок, дадаць ваду, цукар, праварыць 5—10 хвілін, разліць у шкляныя слоікі і закупорыць. Захоўваць у халодным месцы.

1 кг ажынаў, 500 г цукру, 200 мл вады.

Напітак з ажынаў з жаўтком. Узбіць жаўткі, дадаць сіроп з ажынаў, апельсінавы ці мандарынавы сок, астуджаную гатаваную ваду, харчовы лёд, добра перамяшаць і працадзіць у шклянні ці кубкі. Ужываць адразу пасля прыгатавання.

250 мл сіропу з ажынаў, 100 мл соку апельсінавага ці мандарынавага, 4 яечныя жаўткі, 400 мл вады, харчовы лёд.

Кактэйль з ажынамі. Сок з ажынаў, жаўткі, астуджанае гатаванае малако і мёд узбіць у міксеры, дадаць кубікі харчовага лёду.

200 мл сіропу з ажынаў, 400 мл малака, 3 яечныя жаўткі, 1 ст. лыжка мёду, харчовы лёд.

Ажыны

НАРОДНЫЯ НАЗВЫ: чорныя маліны, яжыны, жавікі, скарбарыха, жавіны, жавіннік. Руская назва — ежевика.

На Беларусі растуць паўсюдна, асабліва ў паўднёвых раёнах, па берагах рэк і балот, на ўзлесках, разводзяцца ў садах, на прысядзібных участках.

Шматгадовы паўкуст з дугападобна выгнутымі парасткамі да 1,5 м даўжыні, усаджаны шыпамі, пакрыты шызым налётам. На першым годзе сцёблы растуць, робяцца трывалымі, дзеравянеюць; на другім на іх з'яўляюцца кветкі, паспяваюць ягады, вырастаюць новыя атожылкі, якія сцелюцца па зямлі, некаторыя з іх укараняюцца. Старыя сцёблы з цягам часу адміраюць.

Лісце зверху зялёнае, знізу святлейшае, апушанае, усаджанае калючкамі.

Цвіце ўсё лета, пачынаючы з мая. Кветкі белыя, буйныя, да 2 см у дыяметры, сабраныя ў невялікія шчытападобныя гронкі, якія размяшчаюцца на канцах галін.

Плады — складаныя касцянкі, шчыльна прырастаюць да квсталожа і адрываюцца разам з ім, чорныя, чырвоныя, жоўтыя з шызаватым налётам, сакавітыя, мясістыя, салодкія ці кіслаасалодкія, пахкія. Паспяваюць не адначасова, таму за лета іх збіраюць некалькі разоў. Ягады багатыя на фарбавальныя рэчывы, флаваноіды, солі калію, марганцу, медзі, вітаміны А, групы В, С, Е, каратаноіды. У насенні знойдзены тлусты алей, у каранях — дубільныя рэчывы, тавін, у лісцях — флавіны, арганічныя кіслоты, дубільныя рэчывы. У кветках шмат нектару.

Выдатны меданос.

ЛЕКАВЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ

У народнай медыцыне выкарыстоўваюць ягады, лісце, карані ажынаў.

Спелыя ягады наталяюць смагу, аказваюць гарачкапаніжальнае, патагоннае, агульнаўмацавальнае, супакойвальнае дзеянне. Няспелыя — узмацняюць функцыі страўніка, кішэчніка. Лісце аказвае антысептычнае, вяжучае, кроваспыняльнае, патагоннае, раназажыўляльнае дзеянне, карані — вяжучае, кроваспыняльнае, а сок з каранёў — мачагоннае дзеянне.

Настой лісця ажынаў. 20 г лісця настойваць у 400 мл кіпеню 4 гадзіны, затым працадзіць. Піць па 100 мл 4 разы на дзень за 30 хвілін да яды пры паносах, язвенная хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі, ацёках, гіпертанічнай хваробе, атэрасклерозе.

Настой лісця і кветак ажынаў. 10 г лісця і кветак настойваць у 500 мл кіпеню 4 гадзіны. Піць па 100 мл перад ядой пры гастрытах, паносах.

Адвар з лісця і кветак ажынаў. 10 г лісця і кветак гатаваць у 200 мл вады 15 хвілін, настойваць 2 гадзіны, затым працадзіць. Піць па 1 сталовай лыжцы 4 разы на дзень пры паносах.

Адвар з каранёў ажынаў. 100 г каранёў гатаваць у 500 мл вады да змяншэння першапачатковага аб'ёму напалавіну, затым працадзіць. Прымаць па 1—2 сталовыя лыжкі 3—4 разы на дзень пры захворваннях страўніка, кішэчніка, печані, падстраўнікавай залозы.

Свежыя ягады ажынаў асці пры гастрытах, калітах, паносах, прастудных захворваннях.

Проціпаказанні не ўстаноўлены.

НАРЫХТОЎКА АЖЫНАЎ

НАРЫХТОЎВАЮЦЬ лісце, карані, ягады ажынаў. Лісце збіраюць у час цвіцення, маладыя парастні з лісцем — вясной, сушаць у засені, у памяшканні, якое добра праветрываецца. Карані выкопваюць вясной ці восенню, сушаць у сушылках.

Ягады збіраюць пасля паспявання, сушаць спачатку на сонцы, затым у сушылках, духоўках, печах, пачынаюць з тэмпературы 70—75°С і канчаюць пры 45—50°С. Захоўваюць у сухім памяшканні, якое добра праветрываецца.

Тэрмін захоўвання ягад 1 год, каранёў — 3 гады.

Ніна АЛЯКСЕЙЧЫК, Валер САНЬКО.

У наступным годзе Нараўлянская кандытарская фабрыка «Чырвоны мазыранін» адзначыць сваё 80-годдзе. Аднак напярэдадні юбілею фабрыка перажывае не лепшыя часы.

Працуюць тут выключна на прывазной і імпартнай сыравіне. Значнае зніжэнне і нават частковае спыненне (няма, напрыклад, шакаладнай глазуры) паставак прыводзіць не толькі да скарачэння асартыменту, але і аб'ёму вытворчасці.

Ёсць і іншыя праблемы, вырашэннем якіх заклапочана сёння кіраўніцтва прадпрыемства. Напрыклад, да гэтага часу, за шэсць гадоў, якія прайшлі пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, не заасфальтавана тэрыторыя, хоць на ёй

ёсць месцы, дзе ўзровень радыяцыйнага забруджвання высокі.

А фабрыка ж знаходзіцца ў зоне свабоднага, а не абавязковага адсялення, а значыць, людзі тут будуць жыць і працаваць.

НА ЗДЫМКАХ: такі вось ірыс вараць тут Вольга БАРЫСЕНКА і Марыя СУСІК; гэта — сённяшняя прадукцыя «Чырвонага мазыранна».

Юрый БОНДАРАЎ.

НЕ ВЕШАЙ НОС, БІЯТЛАНІСТ!

Відаць, менш праблем стане ў біятланістаў. Такая думка ўдзельнікаў сустрэчы кіраўнікоў федэрацый па гэтаму віду спорту Латвіі, Літвы, Расіі, Украіны і Беларусі. У Раўбічах, дзе праходзілі перагаворы, вырашана, што пры камплектаванні нацыянальных каманд будуць агульнымі намаганнямі вырашацца пытанні забеспячэння зброяй, боепрыпасамі, інвентаром, адзеннем.

А яшчэ, як сказаў прэзідэнт беларускай Федэрацыі біятлона Рыгор Цішкевіч, спартсмены краін, якія ўваходзяць у Садружнасць, могуць удзельнічаць у спаборніцтвах, праводзімых на іх тэрыторыях, на безвалютнай аснове. Трэнеры і спецыялісты будуць прытрымлівацца агульнай пазіцыі ў дзейнасці федэрацыі біятлона (УІПМБ). Яны таксама былі аднадушнымі ў тым, каб падтрымаць прапанову Новасібірска правесці чэмпіянат свету ў каманднай гонцы і чарговы этап Кубка свету 1994 года

Вячаслаў ДУТАЎ, кар. БЕЛТА.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ
СЁННЯ Ў НУМАРЫ

У Прэзідыуме Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Слова прэм'ера. В. Кебіч: «Мы абавязкова перажывём гэтыя нестабільнасці».

Падпісанне пагадненняў паміж прамысловымі міністэрствамі Беларусі і Расіі і паміж банкамі Беларусі і Расіі.

Наш каментарый. **«Манапалізм і цэны».**

«Па той бок «раю». Трэцяя, заключная, частка аб горкім уроку ў школе капіталізму.

«Чытач чытачу». Падборка.

Юрыдычны клуб. **«Аб прыватызацыі жылля».**

Майстэрня мастака. **«Саўдзел у цудзе».**

Вяртаючыся да надрукаванага. **«Ці ёсць людзі на Зямлі?»**

«Начныя коннікі». Карэспандэнцыя А. Квіра.

«Кругагляд». Агляд міжнародных падзей.

Рэклама. Аб'явы.

НА ДВОР'Е

11 чэрвеня

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, месцамі кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ў Гродна, Віцебску — 15—17, Брэсце — 16—18, Мінску — 17—19, Магілёве — 19—21, Гомелі — 21—23 градусы цяпла.

У наступныя двое сутак чакаюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы — 8—13 удзень — 19—24 градусы цяпла.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту У. СЫЧОВА.

ТВОРЫ КОНКУРСУ СКЛАДАННЯ

У. Клюкін (Мінск)

Белыя: Крg1, Кf5, пп: а7, с7, g6 (5).
Чорныя: Крb7, Фh8, пп: а5, f7 (4).
М. Гарыслаўскі (Стаўрапольскі край)

Белыя: Крс1, Фf4, Лd7, Сh1, Кd6, Кd8, пп: b2, с3 (8).
Чорныя: Крd5, Фh6, Лg1, Лg2, Сf1, Сg5, Кa1, Кс4, пп: а2, а3, с2, с5 (12).

Адваротны мат за 2 хады.

ЗВЕРЦЕ РАШЭННІ

Заданні № 11 і № 12 першага квартальнага конкурсу рашэнняў развязваюцца так:

№ 11. В. Кацнельсон. 1. Сg5! (1. Се7? b1Ф 2. d8Ф Кf6+ 3. С:g6 Ф: g6+ 4. Крh4 Ф:f6 5. Ф:f6 — пат.) Кf6+ 2. С:f6 b1Ф 3. Кg4 Фf5+ 4. Сg5 Фf7+ 5. Крh4 , Ф:d7 6. Кf6+ з выйграшам.

№ 12. М. Рэзваў. 1. Лg8 Ф:g8 2. Лg7 Фе8 3. Лd7 d2 4. е7 d1Ф 5. Лb7+ Фdd7 6. Л:d7 Ф:d7 7. Крg6! Ф:h3 8. е8Ф×.

Цікавая гульня заканчваецца нечаканым правільным матам.

Правільныя адказы на заданне № 12 прыслалі наступныя ўдзельнікі: Ю. Клімоўскі, М. Губчык, В. Лашманаў.

Задане № 11 правільна рашыў М. Губчык.

ПЕРАМОЖЦЫ ЧЭМПІЯНАТА

У Мінску ў Палацы шахмат і шашак праводзіліся вочныя рэспубліканскія спаборніцтвы па рашэнню шахматных кампазіцый. У першы дзень удзельнікам былі прапанаваны тры двуххадоўкі, якія трэба было рашыць за 20 хвілін, тры трохходоўкі (60 хвілін), тры этюды (100 хвілін). На наступны дзень удзельнікі развязвалі тры задачы на канкуратыўны мат (50 хвілін), тры шматхадоўкі (80 хвілін) і тры задачы на адваротны мат (50 хвілін).

У спаборніцтве перамог інжынер з Мінска Уладзімір Барташ. Ен набраў 71 ачко і затраціў 316 хвілін.

Другое месца заняў Мікалай Сігневіч (Мінск) і трэцяе — Валерый Фрыгін (Магілёў).

Далей ідуць: В. Жыбуль — 4 месца, А Стаўскі, Ю. Муйвід (усе з Мінска), С. Даўыдзюк (Кобрын), Я. Дзвізаў (Жлобін), С. Цырулік (Гродзенская вобл.), М. Шкляраўскі (Мінск), В. Зелянкоўскі (Мінск) і У. Іваноў (Наваполацк).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

11 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.45. «Адыходзячы жнівень». Маст. фільм.
16.30. Навіны.
16.35. «Добры дзень у хату!» Сярэдняя школа № 108 г. Мінска.
17.10. «Ромка, Фомка і Артос». Фільмы 1-ы, 2-гі, 3-ці. «Вер-не-вер». Мультфільмы.
18.00. «Фазаны». Кінанарыс.
18.10. Радаўніца ў Левашове.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце мае пісьмо...
19.15. Якія мы гаспадары? Энергазберагаючыя рэсурсы.
19.35. Шанц. Шоу-гульня.
20.10. Тыдзень беларускага ўрада.
20.30. «Перавадоленне». Кінанарыс.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Студыя «КіТ».
23.40. НІКа.

1 канал. Астанкіна

9.20. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
10.50. «Квака-задавака». Мультфільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. У свеце жывёл (з сурдаперакладам).
12.05. Валейбол. Першынство сусветнай лігі. Мужчыны. Зборная ЗША — зборная СНД. Перадача з ЗША.
13.10. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. «Пад дахам фантаннага дома». Канцэрт у Доме-музеі Г. Ахматавай.
14.55. «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі». Маст. фільм. 2-я серыя.
16.00. Разам з чэмпіёнамі.
16.15. Дзіцячы музычны клуб.
17.00. Навіны.
17.30. ...Да 16 і старэйшым.
18.10. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
18.55. «Тэлевізійнае знаёмства». Урмас От гутарыць з Анджэем Вайдам.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «Паненкі з Віжка». Маст. фільм (Польшча).
22.25. АТВ «Глас народа».
23.00. Навіны.
23.25. Хіт-парад газеты «Вечерняя Москва».

Канал «Расія»

9.20. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Цырымонія адкрыцця. Зборная Францыі — зборная Швецыі.
11.50. «Санта-Варбара».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00.—13.20. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. У свеце жывёл.
16.15. Візані.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Прастора плюс.
17.30. Расія і свет.
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Студыя «Нотабене».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Пятае кола.
20.25. У свеце аўта-і мотаспорту.
21.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Югаславіі — зборная Англіі.
23.15. На сесіі ВС Расіі
23.45. Тур-клуб.

12 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Шклянка вады». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
16.30. Навіны.
16.35. Сем колераў радасці.
17.10. «Прыгоды маленькіх сяброў». «Залатыя словы». Мультфільмы.
18.00. «Доктар, зрабіце мяне прыгожай», «Анатоль ды Валянціна з кардона № 8», «Мастацтва ўсіх часоў і народаў». Дак. фільмы.
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Наш каментарый. Чужы сярод «сваіх».
19.15. Тры кіты. Мастацка-публіцыстычная праграма.
20.15. Студыя «Тэлесябрына». «Калі помнім...»
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.45. «Распарадчык балю». Маст. фільм (Польшча).
23.30. НІКа.
23.45—0.25 Міжнародныя спаборніцтвы па кікбаксінгу сярод прафесіяналаў.

1 канал. Астанкіна

7.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Даніі — зборная Англіі.
8.40. «Казка пра Іграў паход». Мультфільм.
9.05. Як дабіцца поспеху.
9.20. «Музычныя інструменты і іх гісторыя» (Германія). 2-я серыя «Валынка».
9.50. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
10.35. «Паехаць — застацца...» Аб лёсах інтэлігенцыі, якая аказала супраціўленне таталітарнаму рэжыму.
11.25. Паэзія ў музыцы.
11.55. Відавочнае-неверагоднае
12.35. «Заліў шчасця». Маст. фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. «Адзін дзень у Крамлі».
15.05. Світанні Расіі.
16.35. ТВ «Нява»: «Хто з намі?»
16.55. «Страчаная «Галактыка». Мультфільм.
17.00. «Кубак з Мурана». Маст. фільм з серыяла «Паляўнічыя на шэдэўры» (Італія).
18.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Галандыі — зборная Шатландыі. У перапынку (19.00) — Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «ВІД» прадстаўляе: «Поле цудаў», «Ток-шоў», «Адпачывай!»
23.00. Навіны.
23.20. «Цень буравесніка». Канцэрт, прысвечаны Дню незалежнасці Расіі.
0.50. «Інспектар Гул». Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. У. Яхантаў чытае вершы А. С. Пушкіна.
8.25. «Галасы з дзяцінства». Харавая студыя на Чырвонай Прэсні.
9.10. Непазнаны Сусвет.
9.55. Вольны час. «ТВ-атэлье».
10.10. Фальклор. «Невядомыя культуры».
10.55. «Вехі. Адзін дзень з жыцця Расіі».
11.25. «Чароўны пярсцёнак». Лялечны спектакль.
12.15. «Я заўсёды буду побач». Дабрачынны канцэрт.
13.00. Весткі.